Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ВВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 18 1934 г. НЯДЗЕЛЯ № 39 (4872)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Большэвіцкае прывітанне V усебеларускаму з'езду спажывецкай кааперацыі!

Усебеларускаму злёту майстроў зімовага спорта

Лепшым фізкультурнікам, удзельнікам Усебеларускага злёта майстроў зімовага спорта — большэвіцкае прывітанне!

Ваш злёт і вашы спаборніцтвы на лепшыя рэкорды з'яўляюцца яркім паказчыкам няўхільнага росту фізкультурнага руху сярод рабочых і фізкультурнікаў Совецкай Беларусі. Ваш злёт з'яўляецца рэзультатам вялікай работы, праробленай комсамолам і профсаюзамі па ахопу фізкультурным рухам шырокіх мас рабочых і калгаснікаў.

ЦК КП(б)Б выказвае ўпэўненасць, што фізкультурнікі БССР, дабіўшыся вялікіх поспехаў у барацьбе за масавы і шырокі ахоп працоўных комплексам «ГПА», змогуць падняць свае спартыўна-тэхнічныя дасягненні да ўзроўня перадавых фізкультурных арганізацый СССР і падрыхтуюць тысячы майстроў совецкага спорта з ударнікаў—рабочых і калгаснікаў—герояў социялістычнага будаўніцтва.

Таварышы фізкультурнікі! Змагайцеся за масавасць пролетарскафізкультурнага руху, за агульны ўздым спартыўнай тэхнікі.

Помніце, што для пабудовы бясклясавага социялістычнага грамадства і ў асаблівасці ў БССР, якая мяжуецца з капіталістычным светам, нам патрэбны жыцціярадасныя, усебакова фізічна-развітыя людзі з жалезнай груддзю і стальнымі мускуламі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО

Выкаваць сотні і тысячы майстроў совецкага спорта

Прывітанне ЦК ЛКСМБ

ЦК комсамола горача вітае ўдзельнікаў першага Усебеларускага злёта майстроў зімовага спорта.

Правіцельнае злёта майстроў — з'яўляецца вялікім пачаткам у барацьбе фізкультурнага руху Беларусі за падняцце і аўладанне спартыўнай тэхнікай шырокімі масамі фізкультурнікаў.

Вопыт лепшых майстроў злёта павінен стаць дастаяннем лепшых совецкіх фізкультурнікаў і мабілізаваць іх на ажыццяўленне задачы «дагнаць і перагнаць у спартыўна-тэхнічных дасягненнях капіталістычныя краіны».

Фізкультурны рух Беларусі можа і павінен выкаваць з ліку вялізарнай масы здаўшых нормы на значок «ГПА» сотні і тысячы майстроў совецкага спорта.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ГЕРЦОВІЧ.

5-ты усебеларускі

Сёння адкрываецца 5-ы ўсебеларускі з'езд спажывецкай кааперацыі. З'езд склікаецца ў пэрыяд, калі ўся краіна прыступіла да рэалізацыі гістарычных рашэнняў 17 з'езда партыі. Гэта накладае асабліва вялікую адказнасць на ўсіх дэлегатаў — прадстаўнікоў нашай спажывецкай сістэмы.

17-ы з'езд завастрыў увагу ўсёй партыі, усёй совецкай грамадскасці на задачы РАЗГОРТВАННЯ ТАВАРАЗВАРОТУ. Тав. СТАЛІН у сваім гістарычным дакладзе падняў пытанне совецкага гандлю на велізарную палітычную вышыню. «КАБ ЭКАНАМІЧНАЕ ЖЫЦЦЁ КРАІНЫ МАГЛО ЗАБІЦЬ КЛЮЧОМ, А ПРАМЫСЛОВАСЦЬ І СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА МЕЛІ СТЫМУЛ ДА ДАЛЕЙШАГА РОСТУ СВАЁЙ ПРАДУКЦЫІ, ТРЭБА МЕЦЬ ЯШЧЭ АДНУ ЎМОВУ, А ІМЕННА — РАЗГОРНУТЫ ТАВАРАЗВАРОТ ПАМІЖ ГОРАДАМІ І ВЁСКАЙ, ПАМІЖ РАЁНАМІ, АБЛАСЦЯМІ КРАІНЫ. НЕАБХОДНА, КАБ КРАІНА БЫЛА ПАКРЫТА БАГАТАЙ СЕТКАЙ ГАНДЛЁВЫХ БАЗ, МАГАЗІНАЎ, КРАМ. НЕАБХОДНА, КАБ ПА КАНАЛАХ ГЭТЫХ БАЗ, МАГАЗІНАЎ, КРАМ, БЕСПЕРАПЫННА ЦЫРКУЛЯВАЛІ ТАВАРЫ АД МЕСЦ ВЫТВОРЧАСЦІ ДА СПАЖЫЎЦА».

У выступленнях на з'ездзе ўскрыт рад буйных недахопаў таваразвароту, далейшае існаванне якіх можа сур'ёзна тармазіць развіццё социялістычнай гаспадаркі. Гэтыя недахопы ўпесцілі і спажывецкай кааперацыі БССР.

Як падкрэсліў у сваім дакладзе тав. Сталін, сучаснае становішча таваразвароту не можа задаволіць нашых патрабаванняў. Развіццё таваразвароту адстае ад велізарнага росту патрабаванняў працоўных мас. Задача павелічэння спажывання працоўных у 2—3 разы ў другой пяцігодцы ва ўсю шырыню стаіць пытанне поўнай ліквідацыі гэтага адставання.

Мы не можам адмаўляць тых буйных дасягненняў, з якімі спажывецкая кааперацыя БССР падыходзіць да свайго з'езда. Даволі толькі прывесці некалькі лічбаў.

Раздробны таваразварот па ГАРАДСКОЙ СЕТЦЫ кааперацыі за два гады павялічыўся на 31 млн. руб., або на 18,8 проц. Таваразварот на ВЁСЦЫ за 2 гады вырас на 32,8 проц. Сельская гандлёвая сетка павялічылася з 3.669 адзінак да 4.585 і наблізілася да спажыўца. Растуць кадры рабочых, ахопленых ГРАМАДСКІМ ХАРЧАВАННЕМ — у 1931 г. было ахоплена 73 проц. усіх рабочых, у 1933 г.—89 проц.

Поўнасцю рэканструявана тэхнічная база ХЛЕБАПЯЧЭННЯ — буйныя механізаваныя хлебазаводы замянілі саматужныя дробныя пякарні.

Але неабходна з усёй рашучасцю падкрэсліць, што развіццё совецкага гандлю яшчэ далёка недастатковае для поўнага і поспага ахопу спажыўца. Больш таго, ЯКАСЦЬ РАБОТЫ гандлёвай сеткі моцна за ўсё можа задаволіць нязмерна ўзросшых запатрабаванняў рабочых і калгаснікаў.

Што характарызуе работу большасці нашых кааперацыйных арганізацый? Сувязь іх з прамысловасцю, прамкааперацыяй і калгасамі выключна слабая. Не наладжан упік попыту насельніцтва, часта ігнаруецца асартымент і якасць тавараў, няма ўмення і жадання вышукваць дадатковыя мясцовыя рэсурсы.

Па гарадской спажывецкай сістэме САМАЗАКУПКІ займаюць толькі 35,5 проц. агульнага таваразвароту. Гэта лічба гаворыць сама за сябе. Кааперацыя яшчэ не пазбавілася традыцыйнай перыяда механічнага размеркавання дэфіцытных тавараў. Яна абмяжоўваецца продажам тавараў з цэнтралізаваных фондаў, не праяўляе ініцыятывы па ўцягненню ў таваразварот прадукцыі мясцовай прамысловасці і кааперацыі.

Перавышэнне таварных астач над планавым па ЗРК і ЦРК на 57,1 проц. выразна сведчыць аб няўменні культурна гандляваць, аб замарожванні таваразвароту.

Яшчэ горшае становішча па вясковай сістэме. Там таваразварот рос за рахунак цэнтралізаванага завозу. Удзельная вага няпланавых закупак складае толькі 12,6 проц. Той факт, што рост таваразвароту на вёсцы значна адстаў ад росту завозу планаўемых тавараў, што таварныя астачы перавышаюць 9 млн. руб. — гаворыць аб дрэннай арганізацыі совецкага гандлю, аб слабым вывучэнні попыту насельніцтва.

На справаздачным сходзе кааперацыі ў Віцебску рабочы Белэнерга камбіната тав. КАРПЕНКА даволі трапна ахарактарызаваў пагардлівыя адносіны ненаторых кааператараў да элементарных патрабаванняў спажыўца:

«Тытуню ў крамах шмат, а курыцельнай паперы няма. Ёсць многа добрых промтавараў, а насавых хустачак не знойдзеш. Ні ў адной краме няма лампавага шкла і запалак. Вінаваты тут кааператары, якія не падумалі аб гэтых таварах». Ці можна дапусціць далей такое абслугоўванне спажыўца? Ні ў якім разе!

Трэба памятаць, што ў другой пяцігодцы рэзка змяняюцца ўмовы совецкага гандлю. ЗНАЧНА ПАВЫШАЕЦЦА ВЫПУСК ПРАДМЕТАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ. ЗАКРЫТЫ ГАНДАЛЬ ПАЧЫНАЕ ЎСТУПАЦЬ МЕСЦА АДКРЫТАМУ. У планах другой пяцігодкі прадугледжана НЯЎХІЛЬНАЕ ЗНІЖЭННЕ ЦЭН НА ТАВАРЫ.

Таму трэба рэзка павысіць якасць совецкага гандлю, каб не дапусціць затаварвання, каб поўнасцю задаволіць попыт рабочага і калгасніка.

Паколькі павялічваецца адказнасць гандлюючых арганізацый за якасць і асартымент тавараў, пастолькі трэба дабіцца, каб кааперацыя кантролем рублём, сістэмай папярэдніх заказаў уздзейнічала на работу прамысловасці, патрабавала ад яе лепшых тавараў. Бо «ТАВАРЫ ВЫРАБЛЯЮЦЦА Ў КАНЧАТКОВЫМ РАХУНКУ НЕ ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЦІ, А ДЛЯ СПАЖЫВАННЯ» (СТАЛІН).

Усебеларускі з'езд спажывецкай кааперацыі павінен паставіць на ўсю шырыню пытанне аб ДАКЛАДНЫМ ВЫВУЧЭННІ І АРГАНІЗАЦЫІ ПОПЫТУ СПАЖЫЎЦА, аб штодзённым уздзеянні гандлюючай сістэмы на работу прадпрыемстваў.

Пановаму ставіцца пытанне аб ПЛАНАВАННІ І КІРАЎНІЦТВЕ ГАНДЛЕМ. Выяўленне і мабілізацыя ўсіх мясцовых таварных рэсурсаў становіцца кроўнай справай кааперацыі. Уласныя самазакупкі нізавой сеткі павінны заняць пераважнае месца ў плане. Толькі тыя кааператары змогуць справіцца са сваімі задачамі, хто здолее адшукаць новыя мясцовыя рэсурсы, паставіць іх на службу спажыўцу.

Усебеларускі з'езд кааперацыі павінен завастрыць увагу на пытанні ўсямернага разгортвання самазагатовак, барацьбы за новыя таварныя рэсурсы, павінен павярнуць кааперацыю тварам да мясцовай прамысловасці, да прамкааперацыі.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце сельпо Касцюковіцкага раёна ў маі 1933 года прызнаў, што Белкаапсаюз праявіў саноўна-панскія адносіны да кіраўніцтва сельпо, пад мяніў жывы інструктаж і аперацыйнае кіраўніцтва папярова-канцылярскім. Гэта ўказанне ЦК поўнасцю захоўвае сваю сілу і зараз.

Адна з асноўных прычын адставання спажывецкай сістэмы — АДСУТНАСЦЬ САПРАЎДНАЙ ПЕРАБУДОВЫ МЕТАДАЎ КІРАЎНІЦТВА, адставанне арганізацыйных форм ад стаячых перад кааперацыяй задач.

17-ы з'езд партыі ў дакладзе тав. Кагановіча і ў сваіх рэзалюцыях асабліва рэзка падкрэсліў неадпаведнасць арганізацыйнай работы гістарычным задачам другой пяцігодкі.

«У арганізацыі таваразвароту, — сказаў тав. КАГАНОВІЧ, — наша задача зводзіцца, папершае, да нармальнага, быстрага і культурнага водпуску тавараў з магазінаў, падругое, да правільнага рэгулявання і плануавання гандлю, да правільнай дастаўкі тавараў у краму, улічваючы попыт спажыўцоў, неабходнасць першачарговага снабжэння тых груп спажыўцоў, якія маюць асабліва важнае значэнне ў народнай гаспадарцы».

Для таго, каб дабіцца гэтага, трэба ў першую чаргу ЛІКВІДАВАЦЬ СТАРУЮ СІСТЭМУ КІРАЎНІЦТВА — ФУНКЦЫЯНАЛКУ. Яна праяўляецца ў кааперацыйнай сістэме ў адарванасці вышэйшых звенняў ад нізэйшых, уізаляванасці іх ад гандлёвых прадпрыемстваў, у падмене канкрэтнага кіраўніцтва агульным, у заціранні ініцыятывы і самадзейнасці нізоўкі, у папяровай цягаціне, у канцылярска-бюракратычных метадах кіраўніцтва, хаваючых за сабой няведанне тэхнікі справы.

З'езд кааперацыі, выходзячы з указанняў 17 з'езда, павінен дабіцца сапраўднага ПЕРАХОДУ АД АГУЛЬНАГА ДА КАНКРЭТНАГА кіраўніцтва кожным магазінам, кожным сельпо.

Неабходна падняць ролю нізавых кааперацыйных арганізацый—ЦРК, сельпо, умацаваць іх людзьмі, значна павялічыць іх правы ў галіне плануавання, збору і расходавання сродкаў. Трэба ЗРАБІЦЬ МАГАЗІНЫ АСНОЎНЫМ ЗВЯНОМ СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ, пашырыць правы загадчыка магазіна, выхаваць асартымент. «Калі пашырыць правы загадчыка магазіна, дык сваёй ініцыятывай ён знойдзе новыя крыніцы тавараў, будзе стымуляваць саматужныя арцелі, упльываць на якасць прадукцыі». (КАГАНОВІЧ).

У цэнтры ўвагі кааперацыі павінна стаяць СЕЛЬПО. Трэба ім даць больш самастойнасці, дабіцца таго, каб усе мясцовыя арганізацыі, пачынаючы ад работы сельпо, як на галоўную, як на родную большэвіцкую справу.

Вялізнае значэнне мае аздараўленне фінансавай гаспадаркі кааперацыі, стварэнне рэнтабельных сельпо. Спажывецкая кааперацыя ў бліжэйшыя гады павінна перайсці на работу ўласнымі сродкамі без дотацыі і крэдытаў. Усебеларускі з'езд павінен усебакова абмеркаваць гэтае пытанне.

Нарэшце, задача разгортвання КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ. Хоч закупак хлеба (на 15 лютага закуплена [illegible]) гаворыць аб яўным ігнараванні гэтай справы. Абавязак кааперацыі ўсімі магчымымі ўздзейнічаць на калгасны гандаль, дабівацца зніжэння цэн, вучыць калгаснікаў культурна гандляваць. Гэтага можна дасягнуць толькі шляхам пашырэння совецкага гандлю, арганізацыі добрых узорных магазінаў.

На вопыце хлебазакупак мы павінны паказаць прыклад таго, як праз совецкі гандаль трэба і можна стрымаць дадатковую колькасць с.-г. прадукцыі.

Усебеларускі з'езд спажывецкай кааперацыі павінен мабілізаваць шматтысячную армію кааператыўных работнікаў на неадкладную і поўную рэалізацыю ўказанняў партыі, дырэктыў 17 гістарычнага з'езда.

19 лютага ў 6 г. веч. у памяшканні Дома культуры

адбудзецца

СХОД ПАРТАКТЫВА

У ПАРАДКУ ДНЯ

даклад аб XVII з'ездзе ВКП(б) (дакл. тав. **ГІКАЛО**)

Члены і кандыдаты ЦК, гаркома праходзяць па сваіх пасведчаннях.

Сакратары парткамітэтаў, парторгі атрымліваюць білеты ў гаркоме, пакой 45.

Гарком КП(б)Б

ГЕРАІЧНЫЯ БАІ АУСТРЫЙСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА СУПРОЦЬ ФАШЫЗМА

УСЕ ТУРМЫ ПЕРАПОЎНЕНЫ РАЗГУЛ ТЭРОРА

БЕРЛІН, 16 лютага (БЕЛТА).

Паводле слоў венскага карэспандэнта «Кельнішэ цэйтунг», у адной Вене арыштавана каля 3-х тыс. удзельнікаў баёў. «Локаль анцэйгер» падкрэслівае, што ўсе венскія турмы і арыштныя памяшканні перапоўнены і што ўрад зняў спецыяльныя памяшканні для размяшчэння палонных.

Узмацняецца расправа над рабочымі, якія прымалі ўдзел у баях. Паводле паведамлення «Нахтаўсгабе», у Лінцы назначан яшчэ адзін кат. Ва ўсіх знешніх раёнах Вены і ў мясцах вялікіх баёў войскі паранейшаму ў баявой гатоўнасці.

* * *

ПРАГА, 16 лютага (БЕЛТА).

Па распараджэнню аўстрыйскага ўрада канфіскуюцца замежныя газеты, якія асвятляюць падзеі ў Аўстрыі, а ўсе тэлеграфныя і тэлефонныя паведамленні замежных карэспандэнтаў, што ідуць за граніцу, падпадаюць найстражэйшай цэнзуры. Некалькі карэспандэнтаў чэхаславацкіх газет арыштавана, адзін з іх выслан.

* * *

ПРАГА, 17 лютага (БЕЛТА).

Згодна паведамленню з Вены, там панае самая разнузданая рэакцыя. За адзін учарашні дзень ваеннапалявымі судамі было вынесена 9 смертных прыгавораў. Пры вобысках у рабочых кватэрах паліцыя творыць бясчынствы — ламае мэблю, ускрывае подлогі, праламвае сцены і т. д.

БАІ Ў ЛІНЦЫ І ЗАЛЬЦБУРГУ

ВАРШАВА, 17 лютага. (БЕЛТА).

«Работнік» паведамляе з Вены, што тэрор супроць венскіх рабочых прыняў нечуваныя размеры. Сучасны фактычны дыктатар Аўстрыі — палоўнакамандуючы хейм'вера Штарэмберг — адкрыта патрабуе расстрэлу ўсіх рабочых, узятых у палон у часе баёў. У раёнах Лінца і Зальцбурга прадаўжаюцца баі.

ЛОНДАН, 16 лютага (БЕЛТА).

У гутарцы з карэспандэнтам «Дэйлі экспрэс» Штарэмберг выказаў быў аддаць належнае мужнасці, праяўленай рабочымі.

«Я павінен,—заявіў ён,—выказаць найвялікшае захапленне перад мужнасцю, з якой змагаліся рабочыя. Яны праявілі выключную адвагу і нават пад кулямётным агнём не пакідалі сваіх пазіцый». Далей ён заявіў, што калі-б рабочыя былі лепш узброены, яны яшчэ доўга маглі-б трымацца.

ПАЛЯВАННЕ НА РАБОЧЫХ

ПРАГА, 16 лютага (БЕЛТА).

Паводле вестак з пагранічных месц Аўстрыі, аўстрыйская жандармерыя літаральна запята паляваннем за рабочымі, якія спрабуюць перайсці чэхаславацкую граніцу. На чэхаславацкую тэрыторыю ужо прыбываюць першыя бежанцы з Аўстрыі. Сярод іх некалькі груп венскіх рабочых, якія змагаліся на барыкадах Флорыдсдорфа і з боем прабіліся ў Братыславу. Усе пераходзячыя граніцу раззбройваюцца чэхаславацкай пагранічнай вартай.

ВАЕННА-ПАЛЯВЫЯ СУДЫ Ў АЎСТРЫІ

АРЫШТАВАНЫХ РЭВОЛЮЦЫЯНЕРАЎ КАТУЮЦЬ ГОЛАДАМ

ВАРШАВА, 16 лютага (БЕЛТА).

З даставерных крыніц паведамляюць, што тысячы забітых рэвалюцыянераў ляжаць у пакойніцкіх Вены.

Арыштаваныя змешчаны ў турмах, пад якія адведзены фабрыкі і пустыя склады. Палоцныя на працягу некалькіх дзён не атрымліваюць яды. Вельмі жудаснае становішча многіх тысяч рабочых сем'яў, кармільцы якіх палі ў баях з фашыстамі ці ўзяты ў палон.

Жанчыны і дзеці выселены з разбураных комунальных дамоў і частка з іх, не гледзячы на зімнія халады, жывуць у палатках у парку Лобау, каля Дуная.

У Вене, Грацы, Леобене, Санкт-Пельтэне ваенна-палявыя суды прыступілі да расправы з рабочымі.

БАРАЦЬБА Ў ПРАВІНЦЫІ ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ПРАГА, 16 лютага (БЕЛТА).

Паступіўшыя з Вены паведамленні сведчаць, што барацьба ў правінцыі ПРАДАЎЖАЕЦЦА ў радзе раёнаў.

Учора ў Вене ўрадавыя войскі праводзілі вобыскі ва ўсіх узятых імі з бою комунальных дамах. Шукалі зброі. Электрастанцыя і газавы завод у Зімерынгу, якія былі заняты рабочымі, аказваўшымі чэцвера сутак узброенае супраціўленне, захоплены войскамі. Члены фабзаўкомаў гэтых прадпрыемстваў арыштаваны.

7.500 ЗАБІТЫХ І РАНЕНЫХ ТОЛЬКІ У АДНОЙ ВЕНЕ

Чэхаславацкае агенцтва вызначае лік забітых у адной толькі Вене ў 2500, а раненых—у 5.000. Лік узятых у палон са зброяй ў руках рабочых і шуцбундаўцаў у Вене хістаецца ад 3-х да 4-х тысяч.

«Право ліду» паведамляе, што ў разбураных рабочых дамах пасёлка Зандлетэн сярод трупаў знаходзіцца 85 дзяцей ва ўзросце да 14 год.

Падводзячы вынікі баёў у Вене, чэхаславацкі друк падкрэслівае, што паўстанне выбухнула стыхійна. Кожны раён, кожны квартал, кожны комунальны дом змагаўся без агульнага стратэгічнага плана і цэнтральнага кіраўніцтва. Адначасова друк падкрэслівае, што социял-дэмакратычныя лідэры далі сябе арыштаваць.

ГАНЕБНЕЙШАЯ ЗДРАДА С.-Д. ЛІДЭРАЎ

Паводле слоў сведак, прыехаўшых з Вены, рабочыя абураны адрадніцкімі паводзінамі социял-дэмакратычнага кіраўніцтва. Аўстрыйскія газеты падкрэсліваюць таксама, што рад социял-дэмакратычных лідэраў у правінцыі адкрыта перайшоў у лагер фашызма.

СОЦЫЯЛ-ШТРЭЙКБРЭХЕРЫ НА КАЛЕНЯХ ПЕРАД РЭАКЦЫЯЙ

Газеты публікуюць заявы социял-дэмакратычнага намесніка кіраўніка правінцыяльнага ўрада Карынтыі Тэйневіца і социял-дэмакратычнага бургамістра Клагенфурта Піхлера. У сваіх заявах яны паведамляюць аб сваім выхадзе з с.-д. партыі і аб стварэнні імі «антымарксісцкага рабочага саюза», падтрымліваючага Дольфуса.

«Рэйхспост» паведамляе, што некалькі кіраўнікоў с.-д. арганізацыі Тыроля і Форальберга падалі заявы аб сваёй лаяльнасці ў адносінах да ўраду.

БАІ У ШТЭЙЕРЫ НЕ СПЫНЯЮЦЦА

Аўстрыйскі ўрад паведамляе аб роспуску 26 рэфармісцкіх профсаюзаў, а таксама «Саюза социялістычных студэнтаў» і с.-д. арганізацый настаўнікаў і жыхароў.

У правінцыі, у прыватнасці ў Штэйеры, баі паміж войскамі і атрадамі ПРАДАЎЖАЮЦЦА. У сувязі з гэтым урад прадаўжае вярбоўку дабравольцаў з былых афіцэраў і перакідае з Вены вайсковыя часці ў Паўночную Штырыю і Верхнюю Аўстрыю.

РУСКІЯ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦЫ ПРАПАНУЮЦЬ ДОЛЬФУСУ СВАЕ ПАСЛУГІ

«Рэйхспост» паведамляе, што учора рускія белагвардзейцы—былыя афіцэры царскай арміі—прапанавалі ўладам свае ўслугі для расправы з рабочымі.

Чэхаславацкі друк адзначае, што нацыянал-социялісты, скарыстоўваючы крытычнае становішча ўрада, умацоўваюць дзейнасць, асабліва ў Верхняй Аўстрыі.

ВОДГУКІ НА ПАДЗЕІ Ў АЎСТРЫІ

МАГУТНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ САЛІДАРНАСЦІ

ЗША

НЮ-ЮРК, 16 лютага (БЕЛТА).

9 тыс. рабочых прысутнічалі на мітынгу салідарнасці з аўстрыйскімі рабочымі, арганізаваным компартыяй. Пасланы пратэсты Дольфусу і аўстрыйскаму пасольству. Учора выйшаў спецыяльны нумар «Дэйлі уоркер», прысвечаны падзеям ў Аўстрыі.

* * *

НЬЮ-ЮРК, 16 лютага. (БЕЛТА).

Дзесяткі тысяч рабочых правялі прыпынненне работ у знак салідарнасці з аўстрыйскім пролетарыятам. Прыпыненне работ арганізавана аб'яднаннем революцыйных профсаюзаў.

Сустрэчы социялістычнымі лідэрамі масавы сход выліўся, напэрэдадзень іх намерам, у баявое выступленне за адзіны фронт. На сходзе прымала ўдзел 20 тыс. рабочых. Социялістычныя лідэры прабавалі выступіць з нападкамі супроць комунізму, а старшыня сходу Лі адмовіў ў слове комуністычнаму аратару. Пасля гэтага социялістыкі лідэраў выклікалі чалавек абурэнне рабочых. Калі радактар «Дэйлі уоркер» падняўся на трыбуну і пачаў сказаць слова, Лі і другія social-лістычныя лідэры абрушыліся на яго з кулакамі. У рэзультаце сутычкі забіта звыш 20 чалавек, у тым ліку адзін паліцэйскі. Пасля сходу рабочыя арганізавалі дэманстрацыю ў цэнтральным парку.

ПОЛЬШЧА

ВАРШАВА, 16 лютага (БЕЛТА).

Учора перад будынкам аўстрыйскага пасольства адбылася бурная дэманстрацыя рабочых. Пры разгоне дэманстрацыі арыштавана 40 чалавек. Кіраўніцтва рэфармісцкіх профсаюзаў Польшчы аб'явіла на 19-га лютага паўгадзінную усеагульную забастоўку салідарнасці з аўстрыйскімі рабочымі.

ЛАТВІЯ

РЫГА, 16 лютага (БЕЛТА).

Сярод рабочых Латвіі пачаліся зборы грошай ў карысць аўстрыйскіх рабочых, пацярпеўшых ад фашысцкага тэрора. Цэнтральнае бюро прафесіянальных саюзаў Латвіі аб'явіла на 17-га лютага 5-мінутную забастоўку салідарнасці з аўстрыйскімі рабочымі.

СКАНДЫНАВІЯ

СТОКГОЛЬМ, 16 лютага (Белта).

Компартыі Швецыі, Нарвегіі, Даніі і комуністычны друк скандынавскіх краін заклікае ўсіх працоўных да дэманстрацый салідарнасці з аўстрыйскімі рабочымі, якія гераічна змагаюцца на барыкадах.

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ДА ПЫТАННЯ АБ НОЦЕ ПАЎПРЭДСТВА СССР У БЕРЛІНЕ

БЕРЛІН, 17 лютага (БЕЛТА).

Германскае міністэрства замежных спраў у сувязі з атрыманнем ноты паўпрэдства СССР аб тэрміновым прыняцці мер да неадкладнага вызвалення Дзімітрава, Папова і Тапева перадала пытанне на разгляд адпаведных інстанцый.

НЕЗАКОРНЫ ВОБЫСК У БЕРЛІНСКІМ АДДЗЯЛЕННІ ТАСС'а

БЕРЛІН, 17 лютага (БЕЛТА).

Сёння ў 11 гадзін раніцы ў памяшканне берлінскага аддзялення ТАСС з'явіліся з паліцэйскія чыноўнікі. Чыноўнікі зрабілі агляд памяшкання аддзялення, кніжных шафаў, газет і т. п. і задалі рад пытанняў супрацоўнікам аддзялення. На пытанне карэспандэнта ТАСС паліцэйскі чыноўнік заявіў, што наведанне аддзялення ТАСС было зроблена з дазволу дзяржаўнай тайнай паліцыі.

Паўпрэдствам гэты факт быў мегакладна даведзен да ведама міністэрства замежных спраў, якое паведаміла, што будуць прыняты меры, каб падобныя факты не паўтараліся.

МІНІСТР БЕК ПРЫБЫЎ У ВАРШАВУ

ВАРШАВА, 16. (БЕЛТА).

Сёння ў Варшаву з Масквы прыбыў міністр замежных спраў Бек. На вакзале Бека сустрэлі члены ўрада, прадстаўнікі міністэрства замежных спраў і прадстаўнікі паўпрэдства СССР у Варшаве. Адначасова з Бекам у Варшаву прыбыў польскі пасланнік у Маскве Лукасевіч.

ВАЕННАЯ ПРАПАГАНДА У ЯПОНІІ

Паводле слоў «Чайна прэс», Японія ахоплена небывалай «ваеннай гарачкай». У ніжэйшых школах прыбыўшыя з Манчжурыі раненыя салдаты «растлумачваюць школьнікам значымасць японскага духу» і прыводзяць довады, чаму японская армія павінна быць «непераможнай».

На лекцыях геаграфіі школьнікам паказваюць спецыяльныя карты. На гэтых картах Японія размешчана ў цэнтры і акружана паслядоўнымі канцэнтрычнымі кругамі, з якіх японці ахапляе берагі Амерыкі. Пры гэтым маецца на ўвазе, што паслядоўнае расшырэнне канцэнтра на карце павінна азначаць паслядоўныя стадыі расшырэння сферы ўплыву Японіі. У падручніках гісторыі падкрэсліваецца «асаблівая місія» Японіі. Дзецям укараняецца ў свядомасць, што пасля руска-японскай вайны Японія была пазбаўлена часткі пладу сваіх перамог з прычыны ўмяшання прэзідэнта ЗША Тэодора Гузвэльта.

Адным з характарных узораў ваеннай прапаганды ў Японіі з'яўляецца ўказанне ваенных прапагандыстаў, што войны, якія Японія вяла ў мінулым, адбываліся кожныя 10 год: вайна з Кітаем у 1894 г., з царскай Расіяй у 1904 г., і з Германіяй у 1914 г., «Гэта—добрая справа — заяўляе японская ваеншчына — перыядычна на весці войны, бо вайна ачышчае душу Японіі ад погані. Тое, што ў 1924 г. не ўдалося весці вайну з'яўляецца найвялікшай пагрозай, якая прыняла да развіцця «небяспечных думак» і да іншых «адмоўных вынікаў».

Адсюль робіцца вывад, ясна усведамляемы японцамі, што наступная вайна павінна адбыцца ў 1934 г. (БЕЛТА).

МІНОТНЫЯ І КАТАРЖНЫЯ Ў ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 16 лютага (БЕЛТА).

Надзвычайны суд прыгаварыў да кары смерцю комуніста рабочага Хютынга. 15 комуністаў прыгаворана да катаржных работ і турмы на тэрміны ад года да 15 год. Усе абвінавачваліся ў тым, што год назад прымалі ўдзел у сутычцы, у часе якой быў забіт нацыянал-социяліст. Смертны прыгавор Хютынгу вынесен не гледзячы на тое, што суд вымушан быў прызнаць недаказанасць забойства нацыянал-социяліста іменна Хютынгам. Большасць асуджаных рабочых—моладзь ва ўзросце 18-20 год.

ПРЫГАВОРЫ

ПАДПІСАННЕ АНГЛА-СОВЕЦКАГА ГАНДЛЁВАГА ДАГАВОРУ

ЛОНДАН, 16 ЛЮТАГА. (БЕЛТА).

СЁННЯ ПАДПІСАН АНГЛА-СОВЕЦКІ ГАНДЛЁВЫ ДАГАВОР. З БОКУ СССР ДАГАВОР ПАДПІСАЛІ ПАЎПРЭД МАЙСКІ І ГАНДЛЁВЫ ПРАДСТАЎНІК ОЗЕРСКІ. З БОКУ АНГЛІІ — МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ САЙМОН І МІНІСТР ГАНДЛЮ РЭНСІМЕН.

„Разгортванне совецкага гандлю з'яўляецца той актуальнай задачай, без вырашэння якой немагчыма далей рухацца ўперад" (СТАЛІН)

Разгарнуць таваразварот

Любаньскае сельпо, якое з'яўляецца буйнейшым у Любаньскім раёне, не выканала плана таваразвароту 1933 года. У 4 квартале замест 350 тысяч руб. таварыства выручыла толькі 270.

У дрэнным становішчы гандлю кааператары абвінавачваюць спажыўца:

— Радзей пачалі захаджваць у крамы калгаснікі, ды і служачыя мала купляюць. Не зразумець, чаго шукаюць... капрызнічае спажывец (?!).

Вопыт любаньскай крамы Белгандлю паказвае, што спасыланні кааператараў на «капрызнічанне» мясцовых калгаснікаў прыкрываюць няўменне і нежаданне гандляваць пасовецку. Крама Белгандлю бойка гандлюе іменна тымі таварамі, якія ў кааперацыі ляжаць без усякага руху.

Гутарка ідзе ў першую чаргу аб **гатовай вопратцы.**

У цэнтральным магазіне сельпо даўно ляжыць вялікая партыя мужчынскіх касцюмаў. Яны валяюцца ў кучах, скомканымі, запыленымі. Каму з спажыўцоў прыдзе ў галаву купіць за 100 з лішнім рублёў брудную анучу, называемую касцюмам! У краме Белгандлю тыя-ж касцюмы раскупаюцца вельмі ахвотна таму, што там умеюць паказаць тавар пакупніку. Касцюмы развешаны, маюць прыемны выгляд.

Сельпо скардзіцца, што няма попыту на трыкатаж і таму нібыта яно не забірае трыкатажныя вырабы з базы. Магазін-жа Белгандлю прытрымліваецца іншай думкі, ён набывае шмат ходкага трыкатажа і хутка яго прадае. Вялікі попыт ёсць на джэмпры, панчохі, шкарпеткі. У чым тут справа? Сельпо нядаўна таксама купіла трыкатаж... адны толькі шаўковыя шкарпеткі. Зразумела, што такія шкарпеткі, якія каштуюць звыш 7 руб. за пару, калгаснікі не купляюць. Яны ляжаць у краме, з'яўляючыся наглядным паказальнікам няўмення працаваць.

Любань—буйнае мястэчка. Вялікі попыт на мэблю прад'яўляюць тут не толькі мясцовыя служачыя, але і прыязджаючыя з усіх сельсоветаў раёна калгаснікі. Сельпо, аднак, не жадае гандляваць мэбляй, за чацвёрты квартал яно прадала мэблі на 128 руб. пры агульным таваразвароце ў 270 тысяч.

Апісаны малюнак характэран амаль для ўсіх сельпо раёна. Чым далей ад Любані, тым горш. Ніхто нізоўкай не кіруе, ніхто ёй не дапамагае. Райсаюз існуе толькі па паперы. З аператыўных работнікаў працуе толькі адзін старшыня тав. **БАРОДЗІЧ.** Няма ні аднаго гандлёвага работніка, ні аднаго інструктара. Ёсць пры райсаюзе база, але на базе звычайна, акрамя завалі, нічога не знойдзеш. Склад часцей заўсёды закрыт на замок. Прыязджаючыя па базу старшыні сельпо часта едуць назад ні з чым. Яны едуць шукаць тавары ў Менск і Слуцак. Выключна дрэннае кіраўніцтва работай нізоўкі, адсутнасць пэўнай сістэмы таваразнабжэння прывяло да затаварвання.

Пераналаджанасць закупак, дрэнны асартымент, няўменне паказаць тавар, бяспрэчна, асноўныя прычыны царыўшага у таваразвароце па Любаньскаму раёну. Аднак, звяртаючы на сябе ўвагу той факт, што план таваразвароту не выканалі нават лепшыя сельпо Любаньшчыны.

Тальскае сельпо вывучала прычыны гэтага з'явішча і знайшло, што поспех гандлю на вёсцы ва многім залежыць ад максімальнага набліжэння тавараў да сяла.

Тальскае спажывецкае таварыства пераканалася ў гэтым на ўласным вопыце. Раней яно лічыла дастатковым мець адну краму на ўвесь сельсавет. Многія тавары былі дэфіцытнымі, і не было недахвату пакупцоў, нават з самых далёкіх паселішчаў. Сельпо не гандлявала, а размяркоўвала тавар.

Зараз абстаноўка змянілася. Калгаснік не жадае хадзіць спецыяльна за таварам за 5-7 кілометраў. Нават у самой вёсцы Тальск, якая расцягнулася на 3 кілометры, кадр пакупцоў складаецца толькі з ваколічных сялян. Калгаснае сялянства патрабуе набліжэння гандлю да вёскі. Што зрабіла Тальскаўскае сельпо? Панаўшы фурманку і нагрузіўшы яе гатовым адзеннем, галантарэяй і гаспадарчымі таварамі, старшыня сельпо стаў аб'язджаць калгасы. Рэзультаты перавысілі ўсякія меркаванні. Ва ўсіх насельніцкіх пунктах, нават у самых далёкіх, развозку акружаў натоўп пакупцоў. У першы дзень яна выручыла 400 руб., у другі 500, у трэці 700. У нядзелю Тальскае сельпо выслала развозку ў Любань і там выручыла 2 тысячы руб. А сталая крама сельспажыўтаварыства, як звычай на, выручала па 200 руб. у дзень. Гэты факт сведчыць, што развозка ахапіла зусім новы кантынгент пакупцоў. Адсюль лагічны вывад, што існуючая ў Тальскім сельсавеце гандлёвая сетка—адна крама—недастаткова. Трэба адкрыць новыя крамы. Сказанае ў адноль кавай меры датычыць і іншых сельпо.

У непасрэднай сувязі з задачай пашырэння гандлёвай сеткі стаіць пытанне аб **арганізацыі раённага універмага,** які-б гандляваў складаным асартыментам. Арганізацыя ўзорнага ўнівермага набывае вялікае значэнне, ён мог-бы з'явіцца школай совецкага гандлю, і значна павысіў-бы крывую таваразвароту ў раёне.

Ф. В.

ХУТЧЭЙ ПЕРАБУДОЎВАЦЦА

На дзверах і сценах гандлёвага кіраўніцтва БКС вывешан загад нач. начальніка тав. **КОЦІНА.** Гэты загад адзначае заслугі раду работнікаў кіраўніцтва ў правядзенні датаворнай кампаніі. Ён падкрэслівае вялікую ролю гандлёвага кіраўніцтва, як арганізатара совецкага гандлю. Ён засцерагае кааператараў і далей дапамагаць нізоўцы, падтрымліваць з ёй цесную сувязь, памятаць, што асноўнае зараз — гэта якасць работы.

Добра, з уздымам напісан загад. Як быццам гандлёвае кіраўніцтва стаіць на вышыні тых адказных задач, якія перад ім пастаўлены. А на справе... нідзе так не адчуваюцца канцылярска-бюракратычныя метады работы, як у гэтым важнейшым сектары Белкаапсаюза.

Людзі прыкаваны да стала, людзі зарылися ў паперках, адарваліся ад жыцця, зусім не ведаюць, што робіцца на мясцах. Адзіны інспектар міжраённых баз **НЕВЯРОВІЧ** ні куды не выязджае, сядзіць у Менску, займаецца чым хочаш, толькі не сваёй непасрэднай работай.

Нам. начальніка гандлёвага кіраўніцтва тав. Коцін з свайго габінета нікуды не выязжае, ён не бывае на нат на Менскай базе. Як можна кіраваць гандлёвай работай пры такіх умовах!

Характэрны прыклад. Галантарэйная фабрыка імя Фрунзе выслала тавар раду баз. Віцебская, Магілёўская, Клімавіцкая, і Барысаўская базы не аплачваюць рахункаў фабрыкі нават на шэснаццаць сумы? У чым тут справа? Дзе прычыны гэтага? У гандлёвым кіраўніцтве не ведаюць становішча баз, бо, падкрэсліваем, няма сувязі з нізавой сеткай. Самі работнікі кіраўніцтва прызнаюцца: «базы працуюць самі сабой, а мы самі сабой».

Аднойчы адміністрацыі прышла ў галаву добрая ідэя — праводзіць перыядычныя гандлёвыя нарады, на якіх заслухоўваць інфармацыі аб рабоце на мясцах. Такія нарады не склікаліся. Гандлёвае кіраўніцтва не мае нават плана работы.

Асноўная фігура ў кіраўніцтве з'яўляюцца **адказныя выязнаўцы.** Іх абавязак кіраваць завозам, адгрузкай і гандлем пэўнымі групамі тавараў, выкручаць і арганізоўваць попыт спажыўца, змагацца за якасць і асартымент.

Яны фактычна перавярваліся ў звычайных тэхнічных работнікаў. Цэлыя дні яны выпісваюць разнарадкі, запаўняюць розныя весткі стучаць арыфмометрамі: адказныя выканаўцы тонуць у лічбах і зусім адарваны ад жывой практычнай работы. Ні адзін з іх не выязджаў на месца, не знаёміўся з тым, як ідзе гандаль, як рэалізуюцца пасланыя імі разнарадкі. Інструкцыі і анкеты вандруюць па сталах, іх пераводзяць у шматлікіх копіях, імі засыпаюць нізоўку — бесперапынна працуе рататар.

Бюракратычныя метады кіраўніцтва глушаць жывую справу.

Трэба было, напрыклад, за ўдарным парадку адгрузіць тавары на стымуляванне хлебазакупак. Разнарадкі на гэтыя тавары тыднямі марнаваліся ў гандлёвым кіраўніцтве. Завод «Інтэрнацыянал», напрыклад, яшчэ 20 студзеня прыслаў рахунак на 200 скрынак цвікоў, адгружаных калінкавіцкай базе. Трэба было паслаць разнарадку базам, якім райсаюзам грузіць тавар. Разнарадка пасланa толькі 1 лютага.

ТАВАРАЗВАРОТ па сельскай кааперацыі БССР (у мільёнах руб.).

28 студзеня Менская база атрымала паўлоўскія скабяныя вырабы. Толькі 31 студзеня база паведаміла аб гэтым гандлёвае кіраўніцтва. Апошняе да 4 лютага разнарадкі не дала, тавар не адгружаўся.

Пазнаёмімся са складам адказных выканаўцаў — так званых таварведаў. Сама назва гаворыць за сябе. Кожны адказны выканаўца павінен дакладна ведаць тую групу тавараў, з якой ён працуе, ведаць «на зубок» асартымент, інакш ён не можа арганізоўваць гандаль, інакш ён не можа ўдзейнічаць на прамысловасць. Што-ж атрымліваецца на справе? Многія выканаўцы не ведаюць сваёй справы, асартымент тавара для іх «кітайская азбука».

Групай парфюмерных і галантарэйных тавараў займаецца тав. **ДУНЕР.** Ён спецыяліст па бакалеі, ён 16 год працаваў з ёй, а у галантарэйных тварах нічога-не разумее. Яго засыпаюць розныя анкетамі і даведкамі аб асартыменце, аб якасці. Дунер толькі бездапаможна разводзіць рукамі.

Трэба было заключыць генеральны дагавор з прамысловасцю на продаж галантарэйных вырабаў. У гэтым дагаворы трэба было падрабязна агаварыць асартымент тавара. У заключаным-жа дагаворы гэты пункт упушчан. Аб ім сказана некалькі агульных фраз. Няхай базы самі даюць падрабязны асартымент для лакальных дагавораў.

Фабрыка «Усход» вызначыла для кааперацыі тавараў на 200 тыс руб. Тав. Дунер паабяцаў даць заяўку — які тавар і якога асартымента патрэбен спажыўцу. Што-ж рабіць? Дунер піша заяўку ў агульнай суме. Што можа даць такая работа!

Тав. **ЛІУШЫЦ** — былы рабочы гарбар, мог-бы прынесці вялікую карысць, калі-б ён займаўся скуранымі вырабамі. Але яго пасадзілі на труне бакалейных тавараў. А абуткам і гумавымі вырабамі займаецца былы профработнік — масавік тав. **КОГАН,** які менш за ўсё ведае гэтыя тавары.

Да апошняга часу ніхто ў гандлёвым кіраўніцтве не займаўся рымарнымі вырабамі, на якія калгасная вёска прад'яўляе вялікі попыт. Сістэма не навучылася гандляваць гэтымі таварамі. Трэба ламаць кансерватызм, вучыць нізоўку новым метадам работы. Трэба дабіцца ад прамысловасці і кааперацыі вопытнасці ў тавараў патрэбнага асартымента і якасці. На кім ляжыць гэты абавязак?

На адказным выканаўцы. А для тав. Когана рымарныя вырабы — «неадкрытая Амерыка». Таму ён ідзе па пратоптанаму бюракратамі шляху — пасылае лісты базам — прышліце, моў, заяўкі, пакажыце патрэбны асартымент. Адказы баз будуць скапіраваны і пасланы куды трэба. Дубліраванне і капіроўка замянілі аперацыйную работу.

Нядаўна тав. Когана атрымаў адказнае заданне — даць папярэдні заказ на абутак і галошы, заказ, які-б адлюстроўваў попыт нізавога спажыўца. Ён зробіць і гэта; але ў яго метадамі бюракратычна-канцылярскай творчасці, настолькі далёкімі ад жывой сапраўднасці, на сколькі стратасфера далёка ад зямлі. Няма нічога дзіўнага ў тым, што на мясцах крычаць аб дрэнным асартыменце, што кааперацыйныя арганізацыі часта адмаўляюцца вы купляць тавар.

Хімічнымі і электратэхнічнымі тварамі доўгі час ніхто не займаўся. Адміністрацыя імкнулася пасунуць гэтыя пытанні адказнаму выканаўцу па групе метызаў і сілікатаў. Той катэгарычна адмовіўся. Тады тав. Дунеру даручылі заключыць, між іншым, дагавор і па гэтай групе тавараў. Хіба гэта не саноўна-панскія, бездушныя адносіны да совецкага гандлю!

Работнікі гандлёвага кіраўніцтва зусім не звязаны з райсаюзамі, сельпо, магазінамі, не ведаюць, якія кадры працуюць у раздробнай сетцы. Гэтым павінен займацца арганізацыйна-інструктарскі сектар БКС. А гэты сектар пытаннямі таваразвароту займаецца між іншым. Іх інспэктараты, гастралюючы па раёнах, займаюцца дзесяткамі пытанняў, і ні аднаго з іх дакладна не вырашаюць. Няма чаго гаварыць, што яны цікавяцца менш усяго дачаламі арганізацыі совецкага гандлю.

Не фармальна, а па сутнасці кіраваць совецкім гандлем — бяспрэчная задача, якая павінна быць вырашана на аснове ажыццяўлення дырэктыў 17 партыйнага з'езда аб ліквідацыі функцыяналкі і арганізацыі пабудовы апарата спажывецкай кааперацыі.

БУТОМАЎ.

УЗОРНЫ МАГАЗІН № 16 У МЕНСКУ.

НА НОВЫМ ШЛЯХУ

ВІЦЕБСК. (Паш кар.). Пастанова ЦК КП(б)Б аб рабоце віцебскай партарганізацыі, якая выклікала пералом ва ўсім палітычнагаспадарчым жыцці раёна, у значнай ступені адбілася і па рабоце Віцебскага ЦРК.

На працягу першых 3 кварталаў 1933 года план таваразвароту па ЦРК сістэматычна не выконваўся. Процант выканання гандлёва-фінансавага плана не перавышаў 85. Самазагатоўкі не былі разгорнуты. Яркі прыклад: ЦРК, які павінен абслужыць звыш 45 тыс. чал., загатовіў у трэцім квартале мінулага года толькі 370 кілограм мяса і 10 кілограм масла. Гандлёвая сетка ЦРК мела страт на 50 тыс. руб., не лічачы 200 тысяч, страчаных па прыгараднай гаспадарцы.

Новае партыйнае кіраўніцтва здолела **перабудаваць работу ЦРК,** узяць яе пад свой большэвіцкі кантроль, аказаць ЦРК практычную дапамогу.

Ужо ў 4-м квартале 1933 года вызначыўся вялікі зрух. Гандлёва-фінансавы план за чацверты квартал перавыканан на 200 тыс. руб. У студзені гэтага года план таваразвароту таксама перавыканан: замест 1.950 тыс. руб атрымана звыш 2 млн.

За апошні час адрамантавана 15 магазінаў, многія з іх прынялі сапраўды культурны выгляд. Адкрыт новы культурны магазін гатовай вопраткі. У магазіне, калі гэта патрабуе спажывец, робяць папраўкі касцюмаў, вопратку не выдаюць без таго, каб яе акурат на не праўцюжыць. У хлебных крамах ліквідаваны чаргі. На паліцах промтаварных магазінаў — вялікі выбар абутку, гатовай вопраткі, галантарэі і інш. тавараў.

Пашырэнне асартымента тавараў, паляпшэнне іх якасці—стрыжань усёй работы гандлёвай сеткі ЦРК.

Дзякуючы паляпшэнню асартымента і ўсё большаму задавальненню патрабаванняў пакупца, расце таваразварот гандлёвай сеткі.

Калі ў першым квартале 1933 года магазіны ЦРК прадалі гатовай вопраткі на 56 тыс. руб., дык у чацвертым квартале прадана гатовага плацця на 551 тыс. руб. Абутку — у першым квартале мінулага года рэалізавана на 104 тыс. руб., у чацвертым — на 496 тыс. руб., за адзін студзень г. г. — на 172 тыс. руб

Галош на працягу першых трох кварталаў 1933 года ЦРК зусім не меў, у чацвертым квартале галош прадана на 80 тыс. руб., у студзені г. г. на 101 тыс. руб.

Амаль на 50 проц. павялічылася штодзённая выручка магазінаў. У трэцім квартале мінулага года гандлёвая сетка ЦРК выручала 44 тыс. руб. у дзень у сярэднім, зараз выручка перавышае 66 тыс. руб.

Праўленне ЦРК зусім правільна ўзяла ўпор на **па-запланавыя закупкі.** Яно дасягнула на гэтым участку пэўных поспехаў. За тры кварталы мінулага года закуплена па-запланавых тавараў на суму 3.200 тыс. руб., у адным чацвертым квартале на 3.770 тыс. руб. Студзеньскі план перавыканан.

Асноўнымі метадамі работы работнікаў прылаўка з'яўляецца ўдарніцтва і соцспаборніцтва на лепшае выкананне колькасных і якасных паказальнікаў.

Асаблівай увагі заслугоўвае нядаўна адкрытая агульна-даступная кафэ-закусачная з вегетарыянскім аддзяленнем. У гэтым кафэ меню мае 15-18 блюд. На сталах кветкі, ля вакон пальмы. Пры кафэ ёсць чытальня, шахматы і шашкі.

Ці можна задаволіцца гэтымі першымі поспехамі? Не. Работа віцебскага ЦРК усё-ж **адстае ад узросшых патрабаванняў працоўных, ад задач, пастаўленых перад кааперацыйным гандлем.** Аб гэтым сведчыць той факт, што астаткі тавараў па гандлёвай сетцы перавышаюць план на 580 тыс. руб. ЦРК не ліквідаваў **затаварвання** ў сваёй сістэме. Вельмі слабы асартымент гаспадарчых тавараў (лампы, вёдры). ЦРК яшчэ слаба звязан з фабрыкамі і заводамі, якія выпускаюць прадметы шырокага спажывання. Далёка не ўсе магазіны перабудавалі сваю работу, — яшчэ патрабуецца шмат на магаццяў, каб ператварыць крамы ЦРК у культурныя ачагі совецкага гандлю.

Наяўнасць растрат, разбазарвання тавараў гаворыць аб тым, што ў апараце ЦРК яшчэ працуюць злодзеі, самаспабжэнцы, чужыя элементы.

Усе гэтыя недахопы былі падкрэслены рабочымі спажыўцамі ў часе справаздачна - перавыбарчай кампаніі.

Кіраўніцтва Віцебскага ЦРК па вінна яшчэ больш упарта змагацца за перабудову ўсёй работы, за падпарадкаванне яе задачам разгортвання культурнага совецкага гандлю.

А. Зарубежны.

Г. ВАКСМАН і Н. ВАУКАВІЦКІ

НАСУСТРАЧ НОВЫМ ВЯЛІКІМ ЗАДАЧАМ

Правадыр нашай партыі тав. **Сталін** у сваім гістарычным праграмным дакладзе на XVII з'ездзе асабліва востра паставіў пытанне аб таваразвароце: **«Разгортванне совецкага гандлю,—сказаў ён, з'яўляецца той актуальнай задачай, без вырашэння якой немагчыма далей рухацца наперад».**

На ўсебеларускім з'ездзе спажывецкай кааперацыі, які сёння адкрываецца, спажывецкая сістэма падыдзе ў першую чаргу вынікі таго, як яна змагалася за разгортванне таваразвароту, як яна развівала і арганізоўвала совецкі гандаль.

У барацьбе за ажыццяўленне дырэктыў партыі спажывецкая кааперацыя БССР дабілася пэўных поспехаў.

Таваразварот па ўсёй сістэме павялічыўся з 445 млн. р. у 1932 годзе да 499 млн. руб. у 1933 г. За адзін год таваразварот узняўся на 12 проц. Значна павялічыўся гуртавы таваразварот. Створаныя два гады назад міжраённыя базы дапамаглі лепшай арганізацыі гандлю, аддараўленню ўсёй работы нізавой сістэмы.

Адной з важнейшых задач спажывецкай сістэмы за мінулы час з'яўлялася **набліжэнне гандлю да рабочага спажыўца,** падпарадкаванне яго задачам паляпшэння рабочага спабжэння і выканання прамфінплана. Удзельная вага ЗРК у агульным таваразвароце павялічылася да 27,4 проц. у 1933 г. супроць 10,6 у 1931 г.

За апошні час прышлося адлаць шмат увагі далейшай рэарганізацыі і паляпшэнню рабочага спабжэння. На 11 буйных фабрыках і заводах БССР арганізаваны ОРС'ы, не гаворачы ўжо аб торфазаводах, лесапрамтасах, дарожным будаўніцтве і транспарце. Што дала гэта рэарганізацыя? **Яна палепшыла снабжэнне вядучых груп прамысловасці і ўдарнікаў,** яна аслабаніла сістэму ад шматлікіх прыхлябацельяў і «мёртвых душ», яна дапамагла ўздыму працоўнай дысцыпліны.

Таваразварот па гарадской сетцы кааперацыі за год вырас на 10 проц., не гледзячы на тое, што значная частка жантынгентаў перашла да сістэмы дзяржаўнага гандлю.

Трэба адзначыць, што агульны рост таварных фондаў у краіне спрыяў выкананню плана завозу цэнтралізаваных тавараў у гарады БССР. Калі напрыклад у 1932 годзе было завезена кандытарскіх вырабаў на 74 проц. плана, дык у 1933 г. на 100. Такое-ж становішча мы маем з рыбай і радам промтавараў.

Кожны рабочы адчувае значнае палепшанне снабжэння гарадзінай і бульбай. Рабочыя нашых прадпрыемстваў у гэтым годзе **атрымалі ў два разы больш бульбы, чым летась.**

Мы можам назваць некаторыя ЗРК і магазіны, якія паказалі ўзоры работы, якія адолелі палепшыць абслугоўванне спажыўца, стымуляваць сваёй работай уздым вытворчасці, добра забяспечыць герояў пяцігодкі і лепшых ударнікаў. Да іх адносяцца ЗРК імя Варашылава, магазін № 43 Гомельскага ЦРК, № 5 Менскага ЦРК, № 120 Віцебскага і т. д.

Аднак гэтыя поспехі маюць толькі адзіныя. **Агульная ацэнка работы гарадской гандлёвай сеткі нездавальняючая.** Рост таваразвароту не суправаджаецца большэвіцкай барацьбой за адшукванне дадатковых таварных рэсурсаў, за разгортванне самазакупак. Многія ЗРК і магазіны жывуць толькі нагнаемі на завоз цэнтралізаваных тавараў, не праяўляюць ініцыятывы, не наладжваюць сувязі з калгасамі і прамкаапераціямі. А матчымасці для ўцягнення новых таварных рэсурсаў у рэчышча таваразвароту велізарныя. Крыніцы дадатковага таваразнабжэння скарыстоўваюцца нашай кааперацыяй у ўсім нязначнай ступені. Даволі адзначыць, што кааперацыя адолела ўцягнуць у таваразварот толькі 9 проц. прадукцыі промкаапераціі.

Аб чым сведчыць такі факт што на працягу двух месяцаў у Бабруйскіх магазінах не было ігоглас. Або адсутнасць, запалак, зусім дрэнны асартымент мэблі... Хіба гэта не гаворыць аб ігнараванні гандлю дастатковымі таварамі, аб няўмоўнай культурнай гандляваць, аб перажытках перыяда механічнага размеркавання тавараў?

Асабліва дрэнна пастаўлен у нас гандаль **гатовай вопраткай.** Ці многа знойдзеце вы магазінаў, дзе вам прадаюць выпрасаваную вопратку, дзе гарнітуры вісяць на вешалках, а не валяюцца ў пылу, дзе пабудаваны будкі для примеркі і арганізаваны майстэрні для дробнага рамонту. Мала, вельмі мала. Практыка цэнтральнага Аршанскага магазіна ЦРК, дзе прыказчыца прымушае пакупніцу тут-жа на ачах наведвальнікаў прымерваць сукенку, — на жаль, не выключэнне. А адсутнасць у абутковых магазінах лавак і крэслаў для таго, каб спажывец мог сесці і прымераць абутак, хіба гэта не сведчыць аб нашляпавельскіх адносінах да работага спажыўца?

Антысанітарыя ўвайшла ў «быт» работнікаў прылаўка. Няма напружанай барацьбы за прывабны культурны совецкі магазін.

Нельга вырашыць задачы разгортвання таваразвароту, ва ўсю шырыню пастаўленай XVII з'ездам партыі, пры тых метадах работы, якімі мы дагэтуль працавалі. **Перабудова магазінаў — асноўнага звяна гандлю, усямернае паляпшэнне абслуговування спажыўца — наш важнейшы абавязак.**

Тыя недахопы, якія ўласцівы гарадской сетцы, яшчэ ў большай меры датычаць **вясковай сістэмы.**

Спажывецкая кааперацыя дабілася ў 1933 годзе павялічэння тавараўвароту на вёсны на 24 проц. у параўнанні з мінулым годам, пры агульным росце таваразвароту на 12 проц. 228 млн. рублёў у 1932 го дзе. 286 млн. — у 1933 г. Такія тэмпы разгортвання совецкага гандлю на вёсцы. Гандлёвая сетка за год павялічылася на 25 проц. і наблізілася да насельніцтва. Аднак якасць работы вясковай сістэмы далёка не на вышыні. Яна не задавальне пазмерна вырасшых патрабаванняў калгаснага сялянства.

Мы маем паасобныя ўзорныя сельпо, выкананыя план таваразвароту, сваёй работай дапамагаўшыя ўздыму калгаснай вытворчасці. Да іх у першую чаргу адносяцца **Ціхініцкае** сельпо, Рагачоўскага раёна, **Сярдзялкоўскае,** Слуцкага раёна, **Гарбачэўскае,** Ушацкага. Гэтыя сельпо здолелі пашырыць асартымент тавараў, давесці яго да калгаснай брыгады, да працоўнага аднаасобніка. Яны з квартала ў квартал перавыконвалі план таваразвароту і маблізацыі ардкаў.

Але большасць сельпо працуе дрэнна, не праяўляе ініцыятывы, не клапаціцца аб абслугоўванні спажыўца, не змагаецца за асартымент і якасць, не вывучае і не арганізоўвае попыт калгаснікаў. Таваразварот расце галоўным чынам за кошт цэнтралізаванага завозу планаемых тавараў. Характэрны факт. Завоз плануемых тавараў павялічыўся за год на 43,4 проц. пры павялічэнні агульнага таваразвароту на вёсны на 24 проц. Параўнанне гэтых двух лічбаў сведчыць і аб тым, што многія вясковыя кааперацыйныя работнікі не ўмеюць рэалізоўваць нават плануемую прадукцыю і замарожваюць таваразварот. Удзельная вага пазапланавых закупак складае 12,6 проц. у адносінах да агульнай сумы таваразвароту. Фактычныя тавараныя астачы складаюць 27 дзён пры плане ў 20.

Злачынная бяздзейнасць раду Райсаюзаў і сельпо прывяла да дэфіцыта нават дастатковых тавараў. У **Тураўскім** і **Брагамльскім** раёнах няма галантарэі. Ва многіх сельпо Дзяржынскага і Лёзненскага раёна нельга знайсці нават такія тавары, як гузікі, гуму, начышкі, шорныя вырабы. Удзельная вага галантарэі ў агульным асартыменце знізілася з 5,2 проц. у 1932 годзе да 4,8 у 1933 годзе. Трэба асабліва падкрэсліць **поўную адсутнасць гандлю мэбляй на раёнах.** Удзельная вага мэблі ў асартыменце тавараў вясковай сістэмы складае ўсяго 0,7 проц.

Да апошняга часу многія кааператары прыкрывалі сваё няўмение гандляваць гутаркамі аб «адсутнасці попыту на мэблю на вёсцы». Не зжыты яшчэ грубейшы скажэнні совецкай палітыкі цэн. У гарадзішанскім сельпо. Магілёўскага раёна, зніжэнне цэн на залежалыя тавары кампенсавалі павышэннем цэн на ходкія. У сельпо Расонскага раёна выяўлены факты самавольнага павышэння цэн на нітки. У Мацпанацкім сельпо, Магілёўскага раёна, пакупцам мануфактуры навязвалі павідла, як прымусовы асартымент.

Окажэнні прынцыпаў совецкага гандлю з'яўляюцца у першую чаргу результатам **засмечанасці апарата спекулянцка-непманскімі, чужымі элементамі.**

Спажывецкая кааперацыя БССР, асабліва гандлёвае кіраўніцтва БКС вельмі слаба змагалася за выкананне прамысловасцю планаў адгрузкі тавараў. Распарадкі і планы спускаліся са спачным спазненнем. На працягу 1933 года былі перабоі ў завозе прадукцыі першай необходнасці: солі, газы, запалак. Вялікая доля віны падае тут на Белкаапсаюз і яго гандлёвыя кіраўніцтвы, якія слаба дабіваліся завозу гэтых тавараў, правілі сапраўды чыноўнікую бестурботнасць і нерухомасць.

Вельмі дрэнна змагаліся нашы каапераціўныя арганізацыі за якасць і асартымент. Колькасць прэтэнзій, прад'яўленых пастаўшчыкам браку, вельмі мізерная.

Адсюль зразумела, чаму толькі 17 райсаюзаў БССР поўнасцю выканалі план таваразвароту.

Некалькі слоў аб арганізацыі **раённых універмагаў.** Гэтыя магазіны павінны з'явіцца апорна-паказальнымі пунктамі совецкага гандлю ў раёне.

Не гледзячы на вялікае значэнне гэтага мерапрыемства, многія райсаюзы сабатуюць выкананне дырэктыў аб адкрыцці універмагаў (Лепель, Тураў, Лагойск, Петрыкаў).

Бліжэйшыя задачы — **актывізаваць работу спажывецкай сістэмы па адшуканню мясцовых рэсурсаў,** устанавіць цесную сувязь з прамарцелы і калгасамі, разгарнуць гандаль такімі дастатковымі тавара мі, як мэбля, галантарэя, шорныя вырабы, усямерна вывучаць і арганізоўваць узросшы попыт спажыўца.

Лозунг тав. Сталіна: **Зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі** абавязвае спажывецкую кааперацыю ў корані перабудаваць метады сваёй работы.

Прыгарадныя гаспадаркі кааперацыі закліканы стаць асноўнай харчовай базай нашых прадпрыемстваў. Гэтай базай яны пакуль што не з'яўляюцца. Кааперасам яшчэ трэба вучыцца ў калектыўных і совецкіх гаспадарак уменню ўсяляць вытворчасць, павысіць ураджайнасць, захаваць ураджай. Большасць кааперасаў з-за адсутнасці на трэбнага гаспадарчага вока працуюць нерэнтабельна, маюць вялікія страты. Няма нагляду за прадукцыйнай жывёлай. Адсюль мізерны выхад таварнай прадукцыі. Адсюль нізкая ўдзельная вага прадукцыі кааперасаў у таваразвароце ЗРК. Часта прадукцыя кааперасаў з-за дрэнных месніцкіх тэндэнцый асядае ўнутры гаспадаркі, разбазарваецца на месцы. Усё гэта вынік выключна дрэннай работы сельгаскіраўніцтва БКС і вельмі слабай дапамогі ЗРК і ЦРК.

Трэба намагчы ўсе сілы, каб вывесці кааперасы з прарыву, каб забяспечыць уздым ураджайнасці прыгарадных палёў.

Сістэма **грамадскага харчавання** падыходзіць да з'езда з радам дасягненняў. Зварот па сетці сталовак павялічыўся за апошні год на 18,7 проц. Калі ў 1932 годзе грамадскім харчаваннем было ахоплена 78 проц. усіх рабочых, дык у 1933 г.—89 проц. Сетка рабочых сталовак павялічылася за тры гады са 185 да 340. Аднак якасць абслугоўвання далёка не на вышыні. Няма ва многіх сталоўках большэвіцкай барацьбы за ўзорнае ўтрыманне зал і кухань, за чыстату, за гігіену, за высокаякасны смачны абед. Ёсць не мала выпадкаў, калі ў сталоўках толькі пеўцоць добрыя прадукты, калі ў кухні і залах месяцамі не змываюць бруд (сталоўкі завода імя Молатава, «Комунарка»).

Задача заключаецца ў тым, **каб зрабіць сталоўкі ўзорнымі, культурнымі, каб за кошт павялічэння дэцэнтралізаваных і пашырэння сувязі з калгасамі і сельпо максімальна павысіць каларыйнасць абедаў.**

XVII з'езд партыі ў дакладзе тав. Сталіна, у рэзалюцыях па дакладу даў разгорнутую праграму барацьбы за ўсямернае задавальненне патрабаванняў працоўных мас, за культурны совецкі гандаль. Справа гонару ўсіх кааперацыйных работнікаў—поўнасцю рэалізаваць дырэктывы гістарычнага з'езда партыі. Задача павысіць спажыванне ў два-тры разы ў другой пяцігодцы абавязвае спажывецкую кааперацыю працаваць сапраўды набольшевіцку, паўдарнаму.

НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ РАДЫЁПЕРАКЛІЧЦЫ АБ РАЗГОРТВАННІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Справу жывёлагадоўлі павінна ўзяць у свае рукі ўся партыя

Тав. СТАЛІН у сваім дакладзе на XVII партыйным з'ездзе даў вычэрпальную ацэнку становішчу жывёлагадоўлі і з усёй рэзкасцю выкрыў недахопы кіраўніцтва гэтай важнейшай галіной сельскай гаспадаркі.

Памяншэнне пагалоўя жывёлы, якое пачалося ў 1930 годзе, прадаўжалася аж да 1933 года. Кулацкая агітацыя за масавы забой жывёлы перад уступленнем у калгасы, засмечанасць калгасаў нутрацкімі элементамі, адсутнасць адпаведнага кіраўніцтва жывёлагадоўляй з боку зямельных органаў, партыйных і савецкіх арганізацый на месцах — усё гэта нанесла вялікія страты жывёлагадоўлі і з'явілася галоўнай прычынай змяншэння стада.

Па БССР, напрыклад, зямельныя органы зусім не цікавіліся пытаннямі аднаўлення стада і гадавання маладняка. Даволі сказаць, што за 1933 год папа 36,7 проц. нарадзіўшыхся парасят. Па асобных раёнах процант падзяжу асабліва паражаючы. Напрыклад, у КАРМЯНСКІМ раёне амаль палова цялят ад ацёлаў 1933 года загінула. У ТЕРАХАЎСКІМ раёне папа 28 проц., у КРУПСКІМ—27.

Поўнае ігнараванне жывёлагадоўлі з боку мясцовых партыйных і савецкіх органаў прыяло да таго, што ў ЛЕПЕЛЬСКІМ раёне загінула 60 проц. апаросаў мінулага года, у Гомельскім раёне—53 проц. і ТУРАЎСКІМ—50 проц.

Тав. СТАЛІН, характарызуючы становішча жывёлагадоўлі, сказаў:

«Можна падумаць, што нашы зямельныя органы праяўляюць піхаманачную дзейнасць па ліквідацыі крызіса жывёлагадоўлі, што яны падымаюць трывогу, мабілізуюць работнікаў і бяруць на прыступ праблему жывёлагадоўлі. На жаль, нічога падобнага не адбылося і не адбываецца. Яны не толькі не падымаюць трывогу... а наадварот, стараюцца замазаць пытанне... утаіць ад грамадскай думкі краіны сапраўднае становішча жывёлагадоўлі, што зусім недапушчальна для большэвіцкіх».

Гэтыя словы тав. СТАЛІНА лішні раз знайшлі сваё пацвярджэнне на Усебеларускай радыё-пераклічцы па пытанню аб рэалізацыі дырэктыў XVII партз'езда і ўказанняў правадыра партыі аб разгортванні жывёлагадоўлі. Радыёперакліч была праведзена ЦК КП(б)Б, ПАЛІТСЕКТАРАМ НКЗ, НАРКАМЗЕМАМ БССР, УПОЎНАРКОМСОЎГАСАЎ і «ЗВЯЗДОЙ» 14 ЛЮТАГА.

Большасць партыйных і савецкіх арганізацый БССР «нават і зараз, пасля з'езда партыі, не прынялі ніякіх сапраўдных канкрэтных мер для таго, каб дабіцца рашучага пералому ў справе захавання і аднаўлення стада. Першыя весткі аб ходзе ацёлаў і апаросаў паказваюць, што рабочыя соўгасаў і калгасныя масы не мабілізаваны на выкананне задач, пастаўленых перад намі XVII партыйным з'ездам у галіне жывёлагадоўлі.

У радзе раёнаў і зараз наглядаюцца злачынныя адносіны да захавання маладняка. Напрыклад, у ЛЕПЕЛЬСКІМ і ЛЁЗНЕНСКІМ раёнах загінула 100 проц. студзеньскіх апаросаў, у ДУБРОВЕНСКІМ раёне—48 проц. У КАСЦЮКОВІЦКІМ раёне папа 36 проц. цялят, у СТАРОБІНСКІМ 33 проц.

Намеснік Наркамзема БССР тав. СТРЭЛЕ, адзначаючы гэтыя моманты ў сваёй уступнай прамове, прапанаваў удзельнічаўшым у пераклічцы раёнам расказаць, што імі зроблена канкрэтнага для рэалізацыі ўказанняў тав. Сталіна і XVII партз'езда па пытанню жывёлагадоўлі.

— Слова прадастаўляецца ГОМЕЛЮ.

Праходзіць мінута, тры, пяць мінут, а гомельская станцыя не адказвае. Першыя 15 мінут пераклічкі показалі, што Беларадыёцэнтр з такой-жа сур'ёзнасцю аднёсся да арганізацыі пераклічкі, з якой гомельскія партыйныя, савецкія і зямельныя органы да свайго ўдзелу ў ёй.

На працягу поўгадзіннага блукання ні ў эфіры, Беларадыёцэнтр ніяк не змог выклікаць свае радыёстанцыі ў Мозыры, Гомелі, Жлобіне і Рэчыцы

„Справу жывёлагадоўлі павінны ўзяць у свае рукі ўся партыя і ўсе нашы работнікі, партыйныя і беспартыйныя, маючы на ўвазе, што праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца такой-жа першачарговай праблемай, якой была ўчора ўжо вырашаная з поспехам праблема зернавая". (СТАЛІН).

Правая рука не ведае што робіць левая

Характэрным прыкладам поўнага няведання сапраўднага становішча спраў у жывёлагадоўчых калгасных фермах з'яўляецца РАГАЧОЎСКІ зямельны аддзел.

Дакладвае загадчык райземаддзелам тав. ЗМУШКО. Ля мікрафона сакратар райкома КП(б)Б тав. Габрусёў, старшыня райвыканкома Зяпёнко.

Тав. Змушко: Да зімы падрыхтаваліся мы вядрэнна. Праведзены выпворчыя нарады, нарады са скотніцамі, даяркамі, праведзен раённы рэйд праверкі падрыхтоўкі да зімоўкі. Увогуле падрыхтаваліся мы да зімы нядрэнна.

Тав. Стрэле: Чым тлумачыцца, што ў Рагачоўскім раёне з студзеньскага ацёлу пала 23,8 проц. цялят. Гэта па вашых весткам.

Тав. Змушко: Мы гэтых вестак не ведаем.

Стрэле: Паўтараю. Гэта па вашых весткам. Чым гэта вашаму тлумачыцца?

Змушко: Мяне цікавіць, ад каго атрымана зводка: ад райаб'яднання жывёлагадоўлі, ці ад зямельнага аддзела?

Вось сапраўды правая рука не ведае, што робіць левая. Загадчык зямельнага аддзела адмаўляецца ад лічбовых матэрыялаў, прысланых ім асабіста ў Наркамзем перад пераклічкай.

Стрэле: Чаму ў вашым раёне аб'ем ранніравання на веснавую сяўбу канцэнтраваных кармоў толькі 25,3 проц., і грубых 32,6 проц.?

Змушко: Гэта справа не ўдаскана лена. На справе становішча не такое. Значна лепшае. Кулацкае ўлік.

Работнікі Наркамзема задаюць тав. Змушко некалькі пытанняў ад імя ліку ў калгасах і праведзенага перапісу ўсяго пагалоўя.

Пыжыкаў: Вы, тав. Змушко, павінны былі да 15 лютага даць праверэныя канчатковыя вынікі па перапісу.

Змушко: У пытанні аб перапісу мы маем агіднае становішча з буйнай рагатай жывёлай, а таксама і з конакім пагалоўем. Калі параўнаць перапіс з тымі лічбамі, якія ў нас былі ў сувязі з улікам аб'ектаў абкладання, то выходзіць, што колькасць коняй паменшылася ў раёне на 11 проц., буйнай рагатай жывёлы — на 16 проц., у тым ліку кароў — на 9 проц., авец — на 26 проц., свіней — на 36 проц. Але ўсе гэтыя лічбы павінны яшчэ быць удасканалены.

Стрэле: Скажы, чым тлумачыцца, што па вашаму раёну з 1 студзеня да 1 лютага пагалоўе свінаматак на фермах зменшылася на 34 галовы, а агульнае пагалоўе на свіна-водчых фермах — на 928 галоў? Куды падзеліся 928 свіней?

Змушко: Такіх вестак я таксама не ведаю.

Пыжыкаў: Вы, відаць, наогул нічога не ведаеце.

Стрэле: Малюнак становішча жывёлагадоўлі па раёну для нас ужо больш-менш зразумелы. Скажыце нам, у якіх калгасах прапрацавана прамова тав. Сталіна і што канкрэтна зроблена для рэалізацыі ўказанняў правадыра нашай партыі па пытаннях жывёлагадоўлі.

Змушко: У гэтай частцы справа стаіць неблагапалучна. З дні таму назад паслалі мы сваіх людзей з райза для прапрацоўкі даклада тав. Сталіна і сваімі сіламі прапрацавалі даклад у 4-х калгасах.

Тав. Пыжыкаў вымушан паклікаць да мікрафона сакратара райкома. Загадчык райземаддзелам, аказ'ваецца, наогул вельмі мала ведае, што робіцца ў раёне.

— Тав. Пыжыкаў: З даклада райземаддзела відаць, што вы не перакліччы партарганізацыю на выкананне дырэктыў тав. Сталіна і 17 з'езда ВКП(б) па пытанню жывёлагадоўлі. Наогул выходзіць, што ўсе лічбы, якія падае райза—не верныя, ён сам у іх не верыць. Што-ж гэта выходзіць?

„Тав. Габрусёў (сакратар райкома). —Я сам здзіўлен, што гэта за белібярда. Я катэгарычна супярэчу супроць гэтых лічбаў падзяжу жывёлы за студзень месяц. Адкуль рай земаддзел узяў гэтыя лічбы для прадстаўлення ў Наркамзем — ніяк не разумею

Вось сапраўды ўзор таго, як раённая партыйная арганізацыя не перакліччыкалася на ажыццяўленне ўказанняў тав. СТАЛІНА па пытаннях жывёлагадоўлі, як раённыя арганізацыі не ведаюць, што робіцца ў іх калгасах, што робіцца на мясцах.

РАГАЧОЎСКІЯ „ФАКІРЫ"

РЫС. ВАЛ. МЕДВЕДЗЕВА.

Аб чым мог-бы расказаць Гомель?

Узяты жлобінскай станцыяй на буксір, Гомель, нарэшце, адгукнуўся:

— У студыі пуста. Ні адзін представіцель мясцовых арганізацый на пераклічку не з'явіўся.

Між тым, гомельскі гарком, горсовет і горземаддзел шмат аб чым маглі-б расказаць дзесяткам тысяч працоўных БССР, якія прымалі ўдзел у пераклічцы.

Замест гомельскіх арганізацый мы даем слова нашаму спецыяльнаму карэспандэнту, наведаўшаму нядаўна Гомельскі раён.

Загляпем па ферму калгаса «ЧЫРВОНЫ ГЕРОЙ» (Дзятлавіцка га сельсовета). У калгасе 273 галовы буйнай рагатай жывёлы. Каровы стаяць у двух хлявах. Хлявы не ацеплены. Крыша не пакрыта. Па хлявах гуляе вецер.

Жывёла корміцца два разы ў суткі. Поіцца адзін раз. Цельныя каровы ў апошнім перыядзе поюцца халоднай вадой.

У снежні на МТФ пала 6 цялят новага ацёлу. У студзені 1934 года нарадзілася чэцвера цялят і ўсе яны таксама загінулі. За зіму палі 4 цёлкі ва ўзросце ад 6 месяцаў да года; прыразалі пяць галоў маладняка і адну карову. Наогул за зіму пала 16 галоў. Былі два выпадкі абортаў.

Загадчык МТФ Марчанка добра разумее прычыну гібелі і абортаў. Увосень жывёлу часта перагаялі праз рэчку, так што каровы прастудзіліся. На зіму паставілі іх у неацепленыя хлявы: Выпіўшы некалькі вёдраў сцюдзённай вады ў дзень, каровы зусім прастудзіліся і амаль што ўсе захварэлі.

Цяляты нараджаюцца ў агульным халодным хляве, ад чаго яны адразу захворваюць на бранхіт і гінуць. У выніку ўсяго гэтага ў калгасе за мінулы год загінула 40 проц. маладняка.

МТФ калгаса «Чырвоны герой» адна з буйнейшых на Гомельшчыне. Здавалася-б, што на гэтую МТФ трэба было звярнуць больш увагі, што яе становішчам павінны былі зацікавіцца і райземаддзел і райжывёлааб'яднанне, каб ліквідаваць тое ганебнае становішча, якое там стварылася. Аднак нічога падобнага мы ў раёне не бачым.

У мінулым годзе на буйнейшай у раёне СТФ калгаса «Пролетарый» апарос 54-х свінаматак даў 350 парасят, з якіх загінула 195. У калгасе «Чырвоны маяк» ад 41 свінаматкі быў апарос у 180 парасят, з якіх загінула 128. Падобных фактаў з практыкі работы калгасаў Гомельшчыны можна прывесці шмат.

Чатыры лічбы характарызуюць становішча жывёлагадоўлі на Гомельшчыне. За 1933 год колькасць буйнай рагатай жывёлы зменшылася па 1.891 галаву, або 12,5 проц., авечак на 2,292—62,7 проц., свіней на 1.236 — 17,7 проц., коняй на 11,8 проц.

Такім чынам па тых самых прычынах, што і ў калгасе «Чырвоны герой» мы маем па ўсяму Гомельскаму раёну абсалютнае змяншэнне пагалоўя па ўсіх відах. Гэта змяншэнне не спыняецца і зараз з пачаткам масавых ацёлаў. Летась адыход цялят па раёну складаў 16 проц., парасят 64 проц. Папярэднія весткі з раду калгасаў і вёсак раёна сігналізуюць аб тым, што ў студзені адыход маладняка не змяншаецца, што прырэзка цялят павялічваецца.

Асноўную прычыну гэтага, разам з дрэнным доглядам, трэба шукаць у адсутнасці якога-б там ні было кіраўніцтва жывёлагадоўляй з боку раённых арганізацый.

На падрыхтоўку кармоў, на сілаванне, на ацяпленне хлявоў і абор увосень ніхто ўвагі не зварачаў. Гэта і прыяло да масавага падзежа пагалоўя зімой.

Якое становішча ў калгасным сектары раёна? Паводле плана раён павінен мець на МТФ 3.820 галоў буйнай рагатай жывёлы, — ёсць толькі 3.279; па СТФ павінна быць 200 свінаматак, ёсць 106. Але на гэтыя фермы ніхто ў раёне ўвагі не зварачае. Ні гарком, ні гарсовет нічога канкрэтнага і практычнага не зрабілі для ўкамплектавання калгасных ферм.

Больш таго, загадчык райземаддзела тав. Ждановіч сядзіць як курыца на яйцах, на статыстычных вестках, паказваючых зніжэнне пагалоўя ў раёне і ніяк не падзівіцца такім «бліскучым» вынікам сваёй работы.

Старшыня райжывёлааб'яднання тав. Фёдараў сядзіць і канстатуе факты, што план мясазагатовак спушчан у МТФ і СТФ нават без яго ведама.

Прэзідыум горсовета адкладвае абгаварэнне гэтага пытання з аднаго пасяджэння на другое. Тым часам сёлетні ацёл як у калгасным, так і ўаднаасобным сектары знішчаецца.

Хіба не аб поўнай адсутнасці кіраўніцтва жывёлагадоўляй з боку раённых і партыйных савецкіх арганізацый гаворыць тое, што на 1801 калгасную гаспадарку зоны МТС ёсць усяго 288 абагуленых свіней, а на 1801 гаспадарку зоны МТС прыпадае ўсяго толькі 55 абагуленых свіней (!!)

Гомель, як буйнейшы пролетарскі цэнтр БССР з шырока разгорнутай сеткай прафскіх арганізацый, меў і мае багацейшыя магчымасці аказаць сапраўдную дапамогу калгасам і сялянам—аднаасобнікам у арганізацыі соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Чэсныя балбатуны

Мазыршчына, як і ўсё Палессе мае выключна-спрыяючыя ўмовы для развіцця жывёлагадоўлі. Тым не менш план камплектавання свінагадоўчых ферм у 1933 годзе сарваў. План па агульнаму свіному пагалоўю выканан толькі на 55 проц., па свінаматках — на 79 проц. За 1933 год у раёне апарасілася 789 свінаматак, нарадзілася 4.167 штук парасят, пала 1.330 штук, што складае 32 проц. За студзень месяц апарасіла ся 9 свінаматак, нарадзілася 47 парасят, з іх пала 8 — або 17 проц.

Гэтыя лічбы прывёў у сваім дакладзе зоатэхнік Мазырскага раёна т. Абрамовіч. Ля мікрафона прысутнічалі прадстаўнікі райкома партыі, райвыканкома, загадчык жывёлааб'яднання.

З Мазырскім раёнам паўтараецца тая самая гісторыя, што і з Рагачовам, калі прадстаўнікі райземаддзела на пераклічцы абвяргаюць імі-ж самімі пасланыя ў Наркамзем весткі. Для таго, каб паменшыць колькасць і процант адыходу маладняка ў студзені месяцы, работнікі райземаддзела і райжывёлааб'яднання стараюцца перанесці гэты адыход у зводкі за лістапад і снежань месяц мінулага года з тым, каб змазаць сапраўднае становішча рэчаў студзені г. г.

Стрэле: Да вас прыязджалі прадстаўнікі Наркамзема, якія правяралі гэтае становішча на месцы. Намі ўстаноўлена, што з нарадзіўшыхся 106 парасят пала 69 штук, што складае куды больш высокі процант, чым той, які вы прыводзілі тут.

Прысутныя ля мікрафона працаўнікі Мазыршчыны нічога канкрэтнага па гэтаму пытанню адказаць не змаглі. Мімаходам высвятляецца, што Наркамзем, запраўпанаваўшы Мазырскаму райземаддзелу атрымаць 670 тон сена з масіва лугаводчага соўгаса, не паклапаціўся паведаміць аб гэтым соўгас. У выніку аказалася, што калі прадстаўнік раёна прыехаў у соўгас за сенам, яму адмовіліся сена выдаць.

Пыжыкаў: У вас прысутнічае загадчык агітмасавым аддзелам райкома тав. Ждановіч. Калі ласка скажыце, што вы зрабілі для арганізацыі практычнага ажыццяўлення пастаноў XV з'езда КП(б)Б і ўказанняў тав. СТАЛІНА аб жывёлагадоўлі.



Адзін з лепшых чыстакроўных быкоў-арцаў жывёлагадоўчага соўгаса «Котпубань» (Сталінградскі раён) бык сементал «Арыстакрат». Прыплод ад яго адрозніваецца хуткаспеласцю і інтэнсіўнасцю росту (да 1,3 кгр. у суткі).

Ждановіч: Гэтае пытанне разглядалася на бюро райкома партыі. Праведзены куставыя нарады ўсіх комуністаў і комсамольцаў. 30 студзеня была праведзена гарадская нарада, правялі мы агульна-партыйны сход, сход комсамольцаў. Паслалі ўпаўнаважаных. Праводзім нарады па гэтаму пытанню.

Пыжыкаў: Нас цікавіць не колькасць праведзеных вамі нарад. Скажыце, колькі калгасаў, соўгасаў раёна ўзялі на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы і як яны іх практычна выконваюць.

Тут ужо агульнымі словамі прадстаўніку Мазырскага райкома КП(б)Б адбаярыцца не ўдаецца. І ён вымушан заявіць, што цяпер ён ужо будзе гаварыць адкрыта, нічога ўтойваць не будзе. І зноў пачаліся разгаворы пра нарады, пра сходы, але нічога канкрэтнага пачуць ад прадстаўнікоў Мазыршчыны не ўдалося.

Пыжыкаў: Наша заўвага па агульнаму вашаму выступленню: Трэба вам зрабіць вывады практычнага парадку, інакш прыдзецца вас аднесці да катэгорыі людзей, якіх тав. Сталін характарызаваў, што мы «арганізоўваем», «робім», «лісты пішам», а вось канкрэтнай справы ў вас не відаць.

Справа ў тым, што прадстаўнікі Мазыршчыны, стоячы ля мікрафона, паказалі не толькі сваё няведанне сапраўднага становішча рэчаў у раёне, але і тое, што ведалі, яны пастараліся ўтаіць ад шырокай грамадскасці.

У цэлым радзе калгасаў раёна мае месца ледзь не пагалоўны адыход маладняка. Так у калгасе «Пабеда», Якімавіцкага сельсовета, адыход маладняка раўняецца 97,5 проц. Агульнае пагалоўе ў гэтым раёне параўнальна з 1932 годам зменшылася на 50 проц., у калгасе «Праўда», Пручкоўскага сельсовета, загінула маладняка 85 проц., у тым ліку свінаматак 64 проц. У калгасе «Совецкая Беларусь», Зеленоцкага сельсовета, загінула 70 проц. маладняка. У калгасе «Рухавік рэволюцыі», дзе адыход складае 78 проц., пад дык тоўку кулакоў размеркавалі на працадні кармовыя і насенныя фонды.

На Мазыршчыне мы сустракаемся з фактам актыўнага супроць дзеяння развіццю свінатаварных ферм нават з боку райжывёлааб'яднання. Вось ужо больш двух месяцаў у раёне стаяць завезеныя 15 пародзістых свінаматак, якія не размяркоўваюцца па калгасах. Райжывёлааб'яднанне, вышукваючы ўсякія аб'ектыўныя прычыны, не размяшчае гэтых свінаматак.

„БЕЛКА В КОЛЕСЕ"

РЫС. ВАЛ. МЕДВЕДЗЕВА.



Шумім, брат, шумім

Не лепшае становішча памалявалі прымаўшыя ўдзел у радыё-пераклічцы прадстаўнікі Рэчыцы, Жлобіна, Слуцка, Бабруйска і Чашнік. Нарады, нарады, сходы, злёты, — але нічога канкрэтнага аб тым, што сёння робіцца ў калгасах для забеспячэння ацёлаў і апаросаў. Характэрна, загадчык Рэчыцкага райземаддзела тав. РАВЁНАК у сваім дакладзе сказаў, што ў раёне да 10 лютага пакрыта толькі 58 проц. свінаматак. На пытанне т. Пыжыкова—таму ў раёне сарвана злучка, — Равёнак адказаў: — Я злучку яшчэ не сарваў.

Пыжыкаў: Калі вы кажаце, што яшчэ не сарвалі злучку, значыць нічога ў свінагадоўлі не разумееце. Вы абавязаны былі злучку правесці ў кастрычніку і снежні месяцах, а выканаўшы план злучкі да 10 лютага толькі на 58 проц., вы адказваецеся спрыяраджаць, што злучка па раёну яшчэ не сарвана.

У Рэчыцкім раёне мае месца масавы забой цялят і дарасят. Тым не менш прысутныя ля мікрафона сакратар райкома КП(б)Б т. Рыжыкаў, загадчык райза, прадстаўнікі МТС заяўляюць, што хоць з справай захавання маладняка ў аднаасобным сектары абстаіць дрэнна, «але ўсё-ж мы сваё навярстаем». Як таварышы з Рэчыцы думаюць навярстаць «сваё», мы не ведаем. Зразумела толькі адно, што калі ў бліжэйшыя дні рэчыцкія раённыя арганізацыі не прымуць рашучых мер для захавання маладняка, сёлетні ацёл і апарос раёна сапраўды загіне.

Як выявілася на пераклічцы, на МТФ і СТФ раёна дрэнна стаіць справа з арганізацыяй працы. Здзельшчына і праміраванне практыкуецца толькі ў 6 калгасах, грашовай узнагароды няма. Для веснавой сяўбы ў раёне забаніравана кармоў грубых — 16,2 проц., канцэнтратаў — 6,6 проц. Праўда, як заявіў т. Равёнак, у раёне два разы праводзілася праверка кармовых фондаў. Але ні першая, ні другая праверка нічога канкрэтнага не далі, бо ніхто сур'ёзна да гэтай справы не падышоў.

Крыху лепш, чым у астатніх раёнах стаіць справа жывёлагадоўлі на Случчыне. План злучкі ў чацвертым квартале ў раёне выканан. Нядрэнна стаіць справа захавання апаросаў. У раёне праводзіцца абмен вопытам паміж лепшымі і горшымі жывёлагадоўчымі фермамі. Але і тут выяўляецца абсалютнае няведанне справы на мясцах, з боку райземаддзела і райжывёлааб'яднання. Хіба не аб гэтым гаворыць той дылетант, які адбыўся паміж прадстаўнікамі Случка і тав. Пыжыкавым.

Пыжыкаў: Вазьміце канкрэтна адзін калгас і прадэманструйце, што вось быў такі-та апарос, столькі-та нарадзілася і столькі захавалася.

Кавальчук (загадчык Случкага райземаддзела): Вазьму калгас імя Розы Люксембург.

Тав. Кавальчук пачынае нешта мармытаць, шукае слоў для сказу, і, нарэшце, аказваецца, што ён такі не ведае, што робіцца на перадавой ферме раёна ў калгасе імя Розы Люксембург. Тав. Пыжыкаў просіць загадчыка агітмасавым аддзелам Случкага райкома тав. ЛАКІЗА адказаць за загадчыка райземаддзела.

І аказалася, што райком КП(б)Б сапраўды ведае лепш становішча на фермах, чым райземаддзел, які непасрэдна гэтым займаецца.

Добра забяспечыў слухання радыёпераклічкі Бабруйскі раён. Ля мікрафона апрача прадстаўнікоў раённых арганізацый прысутнічаюць старшыні калгасаў і загадчыкі жывёлагадоўчых ферм. Усяго 15 чалавек. Перад пераклічкай у раёне быў арганізаван абмен вопытам паміж жывёлагадоўчымі фермамі. У гэту справу было ўцягнута 26 узорных калгасаў, выканаўшых план камплектавання пагалоўя. Наогул у раёне план злучкі выканан толькі на 70 проц. З сёлетняга апаросу атрымана ад 31 свінаматкі 157 парасят, з якіх пала 17 проц. Ацёлілася 211 кароў, пала цялят 10, або 4,7 проц. У раёне арганізавана дапамога для 15 калгасаў, якія не хапае кармоў. Гэтыя калгасы прымацаваны да броварнага завода, перакідаюцца кармы з другіх калгасаў.

БАЛБАТУН З РЭЧЫЦКАГА РАЙЗЕМАДДЗЕЛА ЛЯ МІКРАФОНА

РЫС. ВАЛ. МЕДВЕДЗЕВА.



Справа жывёлагадоўлі— справа ўсёй партыі

Што паказала радыёпераклічка? Амаль ні адзін раён БССР не ўзяўся са ўсёй большэвіцкай настойлівасцю за рэалізацыю ўказанняў правадыра нашай партыі тав. СТАЛІНА аб жывёлагадоўлі. У большасці раёнаў прадаўжаецца старая практыка ігнаравання жывёлагадоўлі. Зямельныя органы замазваюць сапраўднае становішча на фермах. Гэтаму трэба пакласці канец.

«Спадзяваюцца пасля гэтага, што зямельныя органы змогуць вывесці на дарогу і падняць на належную вышыню жывёлагадоўлю — значыць будаваць на пяску. Справу жывёлагадоўлі павінна ўзяць у свае рукі ўся партыя, усе нашы работнікі партыйныя і беспартыйныя, маючы на ўвазе, што праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца цяпер такой самай першачарговай праблемай, якой была ўчора ўжо з поспехам вырашаная зернавая праблема». (Сталін).

Гэтыя ўказанні тав. СТАЛІНА трэба пакласці ў аснову ўсёй далейшай работы па вырашэнню праблемы жывёлагадоўлі. На гэтую справу трэба падняць усю КП(б)Б, усе партыйныя, савецкія, комсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі на мясцах, найшырэйшыя масы рабочых і калгаснікаў, каб ужо ў 1934 годзе дабіцца рашучага пералому на гэтым адказнейшым участку другой пяцігодкі.

Тав. КУЙБЫШАЎ у сваім дакладзе аб другой пяцігодцы, адзначаючы шы вялізарны план будаўніцтва па БССР, сказаў: «ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧАЙ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ШЫРОКАЕ РАЗВІЦЦЁ ПРАДУКЦЫЙНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ З АСАБЛІВЫМ РОСТАМ ЯГО ХУТКАСПЕЛЫХ ВІДАЎ». Сюды трэба сканцэнтраваць максімум сілы і ўвагі. Што адсюль вынікае?

Пачаліся масавыя АЦЁЛЫ. Ад арганізацыі справы захавання маладняка залежыць выкананне планаў росту пагалоўя. Канцэнтруючы максімум увагі на ацяпленні цялятнікаў, на стварэнні ўсіх умоў, забяспечваючых нармальны і здаровы ацёл, трэба ва ўсіх раёнах, вёсках і калгасах дабіцца таго, каб ні адно цялё не пайшло пад нож. Калгасы павінны арганізаваць дапамогу калгаснікам (малаком, грашыма), каб яны поўнасцю захавалі сваіх цялят. Трэба арганізаваць закупку лепшых цялят у калгаснікаў і аднаасобнікаў для калгасных ферм.

Выпрабаваную зброю ў барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва — соцыялістычнае спаборніцтва трэба ў шырокай меры выкарыстаць на гэтай справе. Калгас з калгасам, калгаснік з калгаснікам, вёска з вёскай, аднаасобнік з аднаасобнікам павінны заключыць і выканаць соцыялістычныя дагаворы на поўнае захаванне і лепшае вырашчэнне ўсяго маладняка.

У бліжэйшыя тыдні пачнуцца масавыя АПАРОСЫ. Ужо зараз трэба арганізаваць максімальна спрыяючыя ўмовы для супарасных матак. Добра і правільна прыгатаваны і ў час паданы корм, цёплая вада, мяккі подсціл, — з'яўляюцца галоўнымі ўмовамі для здаровага апаросу.

Важнейшае значэнне набываюць пытанні КАДРАЎ і АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ. Выбіты са ўсіх сваіх пазіцый класавы вораг, выкарыстаўшы прытупленню нашай класавай пільнасці, акапаўся на фермах. Трэба ачысціць фермы ад кулацкіх элементаў забяспечыць догляд пагалоўя лепшымі калгаснікамі ўдарнікамі.

Правільнай арганізацыяй працы ліквідацыяй абязлічкі і ўраўніловкі здаб'ецца выкананне пастаўленай партыяй задачы. Аплату працы на фермах трэба паставіць так, каб калгаснікі былі непасрэдна зацікаўлены ў развіцці жывёлагадоўлі, у выніках сваёй работы.

Ні адзін з удзельнічаўшых у пераклічцы раёнаў нічога не мог сказаць, як стаіць справа жывёлагадоўлі ў АДНААСОБНЫМ СЕКТАРЫ. Між тым, іменна тут мае месца масавы забой цялят і парасят, а райземаддзелы, райвыканкомы, райкомы партыі абмяжоўваюцца роллю нейтральных назіральнікаў, не прымаюць ніякіх мер.

Аднаасобнік — заўтрашні калгаснік. Малейшае ігнараванне працоўнага аднаасобніка ў справе разгортвання жывёлагадоўлі з'яўляецца простым злачынствам перад партыяй. Настойлівай, шырока разгорнутай масава-растлумачальнай работай вакол закона аб цвёрдых мясапостаўках і дырэктыў XVII з'езда ВКП(б) мы павінны ва што-б тамні стала забяспечыць поўнае захаванне ўсяго маладняка і ў аднаасобным сектары.

«НЯМА ЧАГО І ДАКАЗВАЦЬ, ШТО СОВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ, БРАЎШЫЯ НЕ АДНУ СУР'ЁЗНУЮ ПЕРАШКОДУ НА ШЛЯХУ ДА МЭТЫ, ЗДОЛЕЮЦЬ УЗЯЦЬ І ГЭТУ ПЕРАШКОДУ» (Сталін).

ДА ПРАБЫВАННЯ п. БЕКА Ў МАСКВЕ



13 лютага нарком замежных спраў тав. Літвінаў прыняў міністра замежных спраў Польшчы п. Бека.

НА ЗДЫМКУ п. Бек і польскі пасланнік у Маскве п. Лукасевіч на прыёме ў т. ЛІТВІНАВА.

ТЭЛЕГРАМА ПОЛЬСКАГА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ п. БЕКА НАРОДНАМУ КАМІСАРУ ПА ЗАМЕЖНЫХ СПРАВАХ т. М. М. ЛІТВІНАВУ

Народным камісарам па замежных справах т. Літвінавым атрымана з Негарэлага ад міністра замежных спраў Польшчы п. Бека, які знаходзіцца на дарозе ў Варшаву, тэлеграма, у якой п. Бек. дзякуе за аказаную яму ў Маскве гасцінпасць і выказвае перакананне, што яго асабістая сустрэча з т. Літвінавым і гутаркі, якія адбыліся паміж імі, прадстаўляюць і будуць прадстаўляць сур'ёзны этап у справе далейшага развіцця прыяцельскіх адносін паміж СССР і Польскай Рэспублікай.

ПАЎПРЭДСТВА СССР У БЕРЛІКЕ НАСТОЙВАЕ НА ВЫЗВАЛЕННІ ДЗІМІТРАВА, ПАПОВА І ТАНЕВА

БЕРЛІН, 16 лютага (БЕЛТА).

Сёння поўнамочнае прадстаўніцтва СССР звярнулася з вербальнай нотай да германскага міністэрства замежных спраў, пораданай сакратаром паўпрэдства Гіршфельдам. У ноце паўпрэдства давяло да ведама германскага ўрада, што ўрад СССР задаволіў хадайніцтва сваякоў Дзімітрава, Папова і Танева, апраўданых лейпцыгскім судом, якія знаходзяцца пад вартай у Германіі, аб прынцыпі іх у совецкае грамадзянства, бо адпаведныя органы балгарскага ўрада заявілі аб адмаўленні прызнаць іх балгарскімі грамадзянамі. Выходзячы з гэтага, паўпрэдства настойвае перад міністэрствам замежных спраў аб тэрміновым прыняцці мер к неадкладнаму вызваленню совецкіх грамадзян Дзімітрава, Папова і Танева з мэтай іх выезду ў СССР.

Паводле вестак, сёння сястра Дзімітрава і жонка Танева наведалі балгарскіх зняволеных у турме тайнай паліцыі і паведамілі ім аб прыняцці іх у совецкае грамадзянства. Пры спатканні прысутнічалі судовы следчы і некалькі чыноў тайнай паліцыі. Як паведамляюць, маці Дзімітрава не магла з'явіцца на спатканне, бо захварэла з прычыны доўга перажываемай ёю трывогі за лёс сына.

ДЗЕЙНАСЦЬ КАМІТЭТА АБАРОНЫ ДЗІМІТРАВА І ЯГО ТАВАРЫШОЎ

ПРАГА, 16 лютага (БЕЛТА).

Камітэт абароны арганізуе паездку спецыяльнай рабочай дэлегацыі ў Германію, мэта якой—перакананца ў становішчы Дзімітрава, Папова і Танева, а таксама наведаць канцлагеры.

Камітэт апіраецца на летаішнюю заяву германскага міністра прапаганды Гебельса, што ён гатоў прадаставіць замежнай грамадскасці магчымасць праверыць яго ўказанне на «адсутнасць тэрора ў турмах і канцэнтрацыйных лагерах Германіі». У склад дэлегацыі, апрача рабочых, увойдуць віднейшыя журналісты, адвакаты і навуковыя дзеячы Чэхаславакіі. Ад'езд дэлегацыі намечан на канец лютага.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАННЕ ФІНПЛАНА ДРУГОГА ГОДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

НЕАДКЛАДНА ЛІКВІДУЕМ ПРАРЫЎ У ПАСТУПЛЕННІ УЗНОСАЎ ПА ПАЗЫЦЫ

БССР поўнасцю выканала фінплан 1933 года — план першага года другой большэвіцкай пяцігодкі. Па раду важнейшых участкаў мабілізацыі сродкаў план быў нават перавыкапан.

Але ход мабілізацыі сродкаў у студзені гэтага года выклікае пэўную трывогу. Зусім нездавальняючы ідзе наступленне добраахвотных плацяжоў, квартальны план па якіх за студзень выканан на **16,8** проц. Асабліва дрэнна паступаюць **узносы па пазыцы**, у прыватнасці па вёсцы (квартальны план выканан у студзені ўсяго па **12** проц.).

Такое адставанне з выкананнем плана паступлення ўзносаў па пазыцы тлумачыцца перш за ўсё тым, што партыйныя і совецкія арганізацыі раду раёнаў аслабілі сваю ўвагу мабілізацыі сродкаў, зусім не цікавяцца работай фінорганаў і ашчадкас, а больш таго — перашкаджаюць іхняй рабоце. Напрыклад, у **Горацкім** раёне, які па выкананню фінплана і паступленню ўзносаў па пазыцы з'яўляецца адным з адстаючых, ашчадкасу літаральна выкінулі з займаемага памяшкання і занялі яго пад кватэру. Такія-ж з'явішчы мелі месца ў **Жыткавіцкім** і **Прапойскім** раёнах.

З другога боку, работа саміх фінорганаў не на належнай вышыні. Выкрытыя ў **Полацкім, Копыльскім** і некаторых іншых раёнах скажэнні ў практыцы работы ашчадкас, калі масавая работа па ўцягненню ўкладчыкаў падмянялася механічным залічэннем ва ўклады зарплаты рабочых і служачых, — яркае сведчанне гэтаму.

Выкананне фінплана самым цесным чынам звязана з выкананнем плана таваразвароту. Між тым, мы маем выпадкі, як на камбінаце **«Спартак»** (Гомель), дзе сабралася вялікая колькасць гатовай прадукцыі, якая не адгружаецца. Гэта здарылася, з аднаго боку, па віне чыгункі, але больш па віне самога кіраўніцтва камбіната, якое не прыняло патрэбных мер для своечасовай адгрузкі прадукцыі. У выніку прадпрыемства задыхаецца ад адсутнасці зваротных сродкаў, спажывец не атрымлівае прадукцыі, фінплан не выканан.

НКФ Саюза спецыяльнай тэлеграмай папярэдзіў, што **калі наша рэспубліка не даб'ецца неадкладнага рэзкага пералому ў ходзе паступлення ўзносаў па пазыцы на вёсцы, то адлічэнні ад пазыкі ў мясцовы бюджэт будуць прыпынены.** Наркам фін БССР па гэтай падставе прыпыніў адлічэнні ад пазыкі ў мясцовы бюджэт па **Горацкаму, Дубровенскаму, Клімавіцкаму, Чырвонапольскаму, Крупскаму, Пухавіцкаму, Сенненскаму і Стара-Дарожскаму** раёнах і папярэдзіў усе астатнія раёны.

Трэба **мабілізаваць неадкладна ўсе сілы на ліквідацыю прарыву ў паступленні ўзносаў па пазыцы** як на вёсцы, так і ў горадзе, разгарнуць шырокую палітычна-масавую работу і перадачу вопыта перадавых адстаючым. У гэтых адносінах варта спыніцца на вопыце работы калгаса імя **Дзяржынскага,** Ровенска-Слабодскага сельсавета, Рэчыцкага раёна.

Калгас імя Дзяржынскага ў свой час правёў вялікую работу сярод калгаснікаў, а таксама працоўных адпаасобнікаў па падпісцы на пазыку, зараз ён унёс поўнасцю ўз посы па пазыцы. Кожны калгаснік з'яўляецца ўкладчыкам ашчадкасы. У цяперашні момант калгас, дзякуючы адданай рабоце фінударнікаў, дадаткова падпісаўся на пазыку на 315 руб., абавязаўся рэалізаваць на 400 руб. пазыкі сярод адпаасобнікаў, а таксама ўзяў на грамадскі буксір суседнія калгасы, адстаючыя па выкананню заданняў па ўзносах па пазыцы, укладах у ашчадкасы і калектыўнаму страхаванню. Такіх калгасаў нямала ў многіх іншых раёнах і іх вопыт работы павінен быць выкарыстан для таго, каб падцягнуць адстаючых.

Работу па выкананню фінплана неабходна шырока разгарнуць абсалютна на **ўсіх участках** мабілізацыі сродкаў, у прыватнасці і асабліва на такім надзвычай важным участку, як **таваразварот.** Усе раёны Беларусі павінны раўняцца на Менскаму раёну, які, абавязаўшыся да адкрыцця XVII з'езда партыі поўнасцю выканаць студзеньскі фінплан, пабольшэвіцку выканаў узятае самаабавязацельства. Больш увагі, кіраўніцтва і дапамогі мясцовым фінорганам! Усе грамадскія арганізацыі, раённыя, фабрычна-заводскія і нізавы друк, усе пролетарская грамадскасць павінны ўключыцца ў актыўную барацьбу за выкананне фінплана другога года другой пяцігодкі, за права знаходзіцца нашай рэспубліцы ў радах перадавых.

МІХ Р.

Пленум Бюджэтнай камісіі Цэнтральнага выканаўчага камітэта Беларускай ССР

Пленум Бюджэтнай камісіі ЦВК БССР па разгляду даяржаўнага бюджэта на 1934 год склікаецца 19 лютага г. г. у 6 гадзін вечара, у памяшканні ЦВК БССР (Дом урада).

Старшыня Бюджэтнай камісіі ЦВК БССР **Кавальчук.**

ПАВЕДАМЛЕННІ

Гарком КП(б)Б даводзіць да ведама ўсіх прапагандыстаў партыі комсамольскай сеткі, што метад распрацоўкі XVII з'езда ВКП(б) можна атрымаць у канцылярыі Дома комасветы (пог Энгельса і К. Маркса, 30-47, уваход з вул. Энгельса ії паверх, пакой 19).

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 23 лютага, у 10 г. раніцы ў гор. Менску будзе заседаць рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый (Дом урада, правае крыло, 2 паверх, пакой 266) на рашэнні Быхаўскай, Сенненскай, Хойніцкай, Прапойскай, Касцюковіцкай, Шклоўскай, Старадарожскай, Старобінскай, Буда-Кашалеўскай, Дубровенскай, Бабруйскай, Жлобінскай, Любаньскай, Рагачоўскай, Ветка ўскай, Чашніцкай, Мсціслаўскай, Аршанскай, Горацкай, Магілеўскай, Гомельскай, Крычаўскай, Менскай, Полацкай райкамісій па чыстцы наступных тт.:

Трыбна В. І., Дзядзюліна І. Т., Кубароў Е. Н., Політаеў І. А., Парфёнаў М. В., Нікіцін Т., Слусціка І. К., Прохараў І. А., Ільін М. А., Абразоўская Н. Т., Стральцоў А. В., Іванноў С. К., Доўгалеў П. М., Лесніковскі А., Банадысева В. Е., Сямёнаў Т. Д., Нестрэбёнак П. Ан., Твердоўскі Д. Я., Мотуз Е. С., Кандратаў С. І., Эстрын І. Ю., Кутай С. С., Абразоўскі А. А., Шарэнка Ф. Н. Холадцоў Я. Ф., Жаўлакоў Т. А. (Быхаў); Акімаў П. Ф. (дывізіённая); Лукашэвіч І. А. (Слуцк); Фай вішэвіч Б. М., Махонько К. Т. (Глуск); Пракудзін І. Т., Кандраценка І. А. (Клімавічы); Блудчы І. А., Бугаенка В. А. (Камарын); Ліўшыц Л. С., Ганчароў Е. Н., Буйневіч Д. В. (Сянно); Радчэнка А. П., Грытчэнка М. Ф. (Хойнікі); Кіраенак Г. П. (Прапойск); Сідарэнка Н. С. (Касцюковічы); Фесько Н. Ф., Рыбакоў М. К. (Шклоў); Лёгенькі Д. Ф. (Ст. Дарогі); Барбахоўскі Л. І. (Старобін); Кажэўнікаў Ф. І. (Б.-Кашалева); Шмурэў А. З. (Дуброўна); Сушынскі А. Е., Жызнеўскі Я. А. (Бабруйск); Бобрыкаў Н. С. (Жлобін); Чыжонак С. Е., Драздоў Н. І. (Любань); Фрумепкаў І. М., Цэйтліна Е. І. (Рагачоў); Манькоў Е. А., Цамаркоў О. С. (Ветка); Апанасенка К. А., Пятроўскі А. І., Шыдлоўскі А. С. (Чашнікі); Марчанка М. І., Цінман А. І., Глушцоў Л. Г., Кавалёў Н. М., Ляднеўскі Д. І., Чубаноў М. Е. (Мсціслаўе); Бугакоў Н. М., Герміновіч І. А., Суравежка Д. Н., Небожэнка Т. А. (Орша); Анджаеўскі А. В., Анціпенка П. П., Сцепняк Н. Н., Філімонаў М. Ф. (Горкі); Корчак І. С., Гаварцоў С. Ф., Аксенаў А. А., Шальман Л. Р. (Магілеў); Каспючэнка В. М. (Карма); Лурыкаў К. М. (Чавусы); Касцюў А. М. (Петрыкоў); Медзведзеў П. Н., Гладкі С. П. (Менск), Радкевіч А. (Бягомль); Ткачоў Я. Е., Рыўкіна Д. Э., Сак І. Л., Сурымовіч А. Г. (Гомель); Сенчанка П. М., Філатаў С. С., Леснічы І. П. (Полацк).

У сувязі з тым, што многія таварышы, падаўшыя апеляцыі, не гледзячы на неаднаразовыя іх вынікі, не з'яўляюцца, рэспубліканская камісія папярэджвае, што справы неа'явіўшыяся будуць зданы ў архіў без разгляду.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

ХРОНІКА



НОВЫ РЫНАК У МЕНСКУ

Партвыдат і Васнае выдавецтва БССР выпускаюць наступныя кнігі: **ВАРАШЫЛАЎ** «Яшчэ сільней будзем мацаваць абарону совецкай краіны»; **МАНУІЛЬСКІ** «Справаздачны даклад аб рабоце дэлегацыі ВКП(б) у ВККІ»; Тэзісы па дакладах на 13 пленуме ВККІ; **РАБІНОВІЧ** «Гісторыя грамадзянскай вайны»; **ВАРАШЫЛАЎ** «Сталін і Чырвоная армія»

ЦП саюза працмастацтва вылучыў 14 брыгад ад беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Луначарскага, тэхнікума, тэатраў і т. д., для абслугоўвання часцей менскага гарнізона. 23 і 24 лютага Белдзяржтэатр і музкамедыя дадуць бясплатныя пастаноўкі для чырвонаармейцаў. ДАМЭЦ арганізаваў некалькі артыстычных брыгад для абслугоўвання чырвонаармейскіх часцей у раёнах.

ПЕРАД ГАДАВІНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Клуб металістаў арганізуе ў фае вітрыну **«РСЧА за 16 год».** Ад крываецца ваенны кабінет. 22-га лютага ў клубе праводзіцца вечар сустрэчы ўдарнікаў завода імя Варашылава разам з курсантамі АБВШ. 23-га лютага—сустрэча рабочых завода «Комунар» з чырвонаармейцамі падшэфнага палка.

У клубе імя Сталіна 23-га лютага праводзіцца вечар, прысвечаны юбілею. Клуб арганізуе выстаўку-фотавітрыну лепшых варашылаўскіх стралкоў харчовых прадпрыемстваў Менска.

Дынамаўцы праводзяць у межах гадавіны Чырвонай арміі гарадскія і раённыя спаборніцтвы па лыжах і канках (20 кілометраў для мужчын і 5 для жанчын).

Менскі совет «Дынамо» наладжвае стралковыя спаборніцтвы паміж дынамаўцамі Менска і Смаленска.

Арганізаваны фадыперадачы аб Чырвонай арміі на розных нацыянальных мовах і на эсперанто. 19-га лютага ля мікрафона выступяць прадстаўнікі Н-скай дывізіі. 21 лютага па радыё — чырвонаармейская самадзейнасць. Выступяць чырвонаармейцы пісьменнікі, музыкі, спевакі, заспявакі.

22-га лютага — спецыяльны вечар АБВШ. Даклад «Наша армія—армія сусветнай пролетарскай рэвалюцыі», канцэрт. 23-га лютага — вялікі радыёвечар для менскага гарнізона.

Кінатэатры рыхтуюць фотавітрыны аб Чырвонай арміі. У юбілейныя дні будуць даны бясплатныя сеансы для чырвонаармейцаў.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ МАЙСТРОЎ ЗІМОВАГА СПОРТА

Сёння, у 4 г. 30 м. дня, на стадыёне «Дынамо» адбудзецца ўрачыстае адкрыццё ўсебеларускага злёта майстроў зімовага спорта.

Менскія канькабежцы разам з удзельнікамі злёта наладжваюць парад.

У першы дзень у праграме спаборніцтва майстроў па бегавых і простых каньках і фігурнае катанне. Дыстанцыя—100, 500, 5.000 метраў.

19-га лютага на ўсебеларускім стадыёне спаборніцтва майстроў па лыжах. Дыстанцыі — 20 кілометраў для мужчын і 5 для жанчын.

У гэты-ж дзень на стадыёне «Дынамо» прадаўжэнне спаборніцтваў на простых і бегавых каньках. Дыстанцыя—500, 1000, 5.000 і 10.000 метраў; і фігурнае катанне.

20-га лютага ў Доме Комасветы—вечар сустрэчы ўсебеларускіх майстроў з менскімі фізкультурнікамі, на якім будуць падагулены вынікі злёта і прэміраваны пераможцы.

У спаборніцтвах прыме ўдзел каля 50 лепшых майстроў БССР. Апрача таго, запрошаны лепшыя майстры Саюза, у прыватнасці на каньках **МЕЛЬНІКАЎ, ІПАЛІТАЎ;** па лыжах—**ВАСІЛЬЕЎ** і фігурысты **ТАЛМАЧОЎ, ГРАНАТКІН** і інш.

65 ТЫСЯЧ СТРАЎ У ДЗЕНЬ

Пуск першай у БССР фабрыкі-кухні ў Менску намечан у другім квартале бягучага года. Прапускная здольнасць фабрыкі звыш 65 тыс. страў у дзень. Арганізуюцца вытворчасць кандзіцерскіх вырабаў і спецыяльны пакой на 300 дзяцей. Фабрыка поўнасцю механізуецца. Будуецца лабараторыя. Агульны кошт будаўніцтва—звыш 2 з пал. млн. руб.

ЗАГАД № 17
па Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР

г. Менск 23 студзеня 1934 г.

Урадам СССР і БССР устаноўлены дакладныя тэрміны прадстаўлення вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва: два разы ф м-ц—на 1 і 15 кожнага м-ца. На 15 студзеня непрадставілі вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва наступныя раёны: Буда-Кашалёўскае, Глускае, Огара-Дарожскае; не далі вестак ашчадкасы: Гарадоцкая, Гомельская, Даяржынская, Жлобінская, Любоцкая, Плешчаніцкая, Рагачоўская, Расонская, Сенненская і Суражская, а па плацяжах з аграмаджанага сектара не далі вестак наступныя раёны: Клімавіцкае, Чырвонапольскае, Крупскае і Терахоўскае.

Лічачы такое становішча недапушчальным, грубым парушэннем закона, службовай дысцыпліны, загадваю:

1. Абвясціць суровую вымову загадчыкам раёнаў: Буда-Кашалёўскага, Слупкага, Огара-Дарожскага, Клімавіцкага, Чырвонапольскага, Крупскага і Терахоўскага за непрадстаўленне вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва і па абагуленым плацяжам.

2. Абвясціць суровую вымову загадчыкам ашчадкасаў: Гарадоцкай, Гомельскай, Даяржынскай, Жлобінскай, Лагойскай, Плешчаніцкай, Рагачоўскай, Расонскай, Сенненскай і Суражскай і вымову загадчыкам раёнаў гэтых раёнаў за слабае кіраўніцтва ашчадкасамі, што выразілася у незабеспячэнні поўнага і своечасовага прадстаўлення устаноўленых вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва па лініі гэтых ашчадкас.

3. Папярэдзіць загадчыкаў горраёна і гарашчадкас аб неабходнасці своечасовага прадстаўлення вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў строгай адпаведнасці з дырэктывамі Саюзнага і Беларускага ўрада.

4. Прасіць старшыню Праўлення Белкаапсаюза т. Царонка знішчыць расхлябанасць райспажыўсаюзаў у справе прадстаўлення вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва (пазвы, накладныя кааперацыі) і забяспечыць поўнае і своечасовае прадстаўленне гэтых вестак НКФіну па сістэме каапераціі на 1 і 15 кожнага м-ца.

5. Абавязаць т. т. **Нісневіча, Фальгіна, Эйдліна і Грунфеста** строга сачыць у далейшым за поўным і своечасовым прадстаўленнем вестак па мабілізацыі сродкаў насельніцтва і па плацяжах з абагуленага сектара, а т. **Варшаўскага**—устанавіць на лініі ашчадкас строгі парадак своечасовага прадстаўлення вестак па мабілізацыі сродкаў і наогул—ажыццяўляць усякае адставанне ў гэтых адносінах, аб чым не раз указвалася Наркамфінам.

Народны камісар фінансаў БССР ХАЦКЕВІЧ.

ПЕРШЫ ДЗЯРЖ. ТЭАТР (БДТ—1)
Сёння, 18 лютага —„МІЖБУР'Е"
Пачатак у 8 гадз. веч.

Памяшканне Дзяржаўн. польскага тэатра (Совецкая, 29. тэлефон 21-812)
Гастролі Маскоўскага Дзяржаўн. тэатра МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ
Мастацкі кіраўнік Валеры БЕБУТАЎ
Сёння, 18 лютага „КОЛОКОЛА КОРНЕВИЛЯ"
Білеты—у касе тэатра з 5 да 9 гадз. Па калектыўных заяўках білеты ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 гадз.

Кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — ВЫСПА ТАЙН — 1 серыя „У пошуках скарба" У фае—канцертнае аддзяленне.

Кіно Інтэрнацыянал — Замежны мастацкі фільм ДЭБЮТ МАРЫЗЫ — драма ў 6 частках.

Кіно Пролетарый — Замежны трука-прыгодны кіно-роман НАЧНЫ ЭКСПРЭС — 2 серыі (10 частак) у адзін сеанс.

Дзіцячы Гукавы кіно-тэатр — СЁМЫ СПАДАРОЖНІК — у 6 частках. У праграме гуманны хроніка.

Кіно „Спартак" — ПРЫГОЖАЯ ГАЛЕНА — 1-я серыя ў 6 частках.

Нова-арган вуемаму трэсту па загатоўках жывёлы
Племзаготтрэсту патрэбны:
ВЕТДОКТАР.
БУХГАЛТАР.
ЗАГ. БАЗАЙ.
Агенты-загатоўшчыкі пав'язны быць тэхнікі-жывёлаводы і ў крайнім выпадку—калгаснік, працаваўшы на МТФ.
Звяртацца па адрасу: Менск, Дом Урада, пакой 123. Племзаготтрэст.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б «ПАРТВЫДАТ»
ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРАДАЖУ БРАШУРА
Я. Э. РУДЗУТАК— адчот XVII з'езду партыі аб рабоце ЦКК ВКП(б)
Стар. 64. Тыр. 30.000 экз.
Заказы накіроўваць—Менск, Карла Маркса, 14.

„АРЫШТАНТ САКРЭТНЫ, ФІГУРЫ НЕ МАЕ"
У новым гукавым фільме вытворчасці БЕЛДЗЯРЖКІНО „Паручык Кіжэ".

КУРСЫ ВОСУ арганізуюць
Тры 6-месячныя групы бухгалтараў-экзамен'стаў
для саўгасаў сістэмы Наркомсавгаса. Стыпендыя ад 115 да 15 руб., інтэрнатам 25 руб. у м-ца. Інтэрнат курсанты не забяспечваюцца. Прымаюцца бухгалтары не менш як з 2-гадовым стажам. Да заяў дадаць дакументы: аб асвеце (7 гр.), аб узросце, аб стажы, аб адносінах да ваеннай службы і аб асвабаджэнні ад апошняга месца працы.
Заявы падаваць у канцылярыю ВОСУ (Менск, Рэвалюцыйная, 3, уваход со двора) да 5 сакавіка ад 10 да 12 г. дня. Пасля прыёму будзе паведамлена пісьмова.

РАБФАК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА адкрывае тасіцімесячныя КУРСЫ
па падрыхтоўцы ў БДУ з адрывам ад вытворчасці.
Прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых і калгаснікі з адукацыяй не ніжэй самігодкі з 3-гадовым вытворчым стажам, ва ўзросце ад 18 да 33 год.
Да заявам трэба далучыць наступныя дакументы: засведчаную анкету, давадку аб адукацыі, аб соцпахаджэнні, аб вытворчым стажы, аб узросце.
Прыём заяў адбываецца ў канцылярыі рабфака (Універсітэцкі Гарадок блокорпус, пакой № 308) ад 10 да 14 гадз. і ад 18 да 20 гадз., апрача выходных дзён.
Залічэнне забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам.
Пачатак заняткаў 25 лютага г. г.
Дэканат Рабфака.

МЕНСКАЯ Горашчадкаса № 16 ПЕРАЕХАЛА на СОВЕЦКУЮ, 43 (Дом ВКС, былое памяшканне Усебанка).
Менгорашчадкаса № 16.

Беларускаму Геалогічнаму Гідрагеадэзічнаму трэсту патрабуецца на СТАЛУЮ РАБОТУ нач. фінансавага аддзела —галоўбух.
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
Звяртацца—Менск, Совецкая, 82

З'ЕЗД НАСТАЎНІКАЎ-УДАРНІКАЎ ПА ДЫРЭКТЫВЕ АДПАВЕДНЫХ ОРГАНАЎ ПЕРАНОСІЦЦА на 1-е сакавіка 1934 года.
Усім райана і гарана не аслабляць падрыхтоўку да з'езда.
Нкасветы.

УСІМ ТРЭСТАМ І ГАСПАДАРЧЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ!
У сувязі з тым, што рад прадпрыемстваў не прадстаўляюць паведамленняў аб кшчасных выпадках, матывуючы адсутнасцю бланк,
АДДЗЕЛ АХОВЫ ПРАЦЫ ЦСПСБ АБАВЯЗВАЕ ўсе ТРЭСТЫ У ТРОХДЗЕННЫ ТЭРМІН
забяспечыць усе свае прадпрыемствы БЛАНКАМІ паказаных паведамленняў, якія ёсць у продажы ў магазінах Саюзоргучота (Ленінская, 2).
Інспектарам працы ПРАПАНУЕЦЦА неадкладна праверыць пастаноўку ўчоту і своечасовасць прадстаўлення паведамленняў аб нящчасных выпадках і асоб, вінаватых у парушэнні законадаўства аб парадку рэгістрацыі і прадстаўленні паведамленняў аб нящчасных выпадках (Пастанова НКП СССР ад 11-III—29 г. № 109, „Известия НКТ СССР" 1929 г. № 12-13—1930 г. № 3).
ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЦІ.
АДДЗЕЛ АХОВЫ ПРАЦЫ ЦСПСБ.

ЦС АЎТАДОРА БССР
даводзіць да ведама трымальнікаў білетаў 5-га разрада 4-й аўталатарэі, што ТЫРАЖ гэтага разрада адбудзецца ў пачатку сакавіка м-ца 1934 г. у гор. МЕНСКУ.
Усе гарадскія і раённыя Саветы Аўтадора абавязваюцца зрабіць канчатковы разлік з калектывамі, сельсоветамі і паасобнымі таварышамі сабраць усе нерэалізаваныя білеты і даслаць у ЦС Аўтадора БССР (г. Менск, Совецкая 82) каштоўнай пасылкай не пазней 20-га лютага 1934 г.
ЦС АЎТАДОРА БССР.

Менск, друкарня «Звязды». Упаўн. Гапоўлітбела № К—2428